


Наша Слова

Культурна-асветніцкая штотыднёвая беларуская газета

(Выходзіць з сакавіка 1990 г.) **№ 8 (324)** 20 — 26 лютага 1997 г. Кошт -- 1500 рублёў

ПОСТУП ТЫДНЯ



● **На пашыраным пасяджэнні Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь Аляксандр Лукашэнка, гаворачы аб знешняй палітыцы, у прыватнасці, сказаў:** "Усё часцей гучыць пытанне аб аб'яднанні Расіі і Беларусі. На карысць народа мы пойдзем на супрацоўніцтва з любой дзяржавай. Але мы не станем нічыім раёнам або губерніяй. Мы гатовы да раўнапраўнага саюза і не здрадзім суверэнітэту".

● ***Сваю першую прэс-канферэнцыю з журналістамі правёў намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Іван Пашкевіч.*** *Сустрэча пачалася з заявы Івана Іванавіча аб тым, што адносіны з прэсай у далейшым будуць грунтавацца на адкрытасці, аб'ектыўнасці і супрацоўніцтве. І.Пашкевіч акрэсліў кола сваіх службовых абавязкаў. Сярод іх — фармаванне дзяржаўнай маладзёжнай палітыкі, распаўсюджванне ўшыркі і ўглыб беларускай мовы і нацыянальнай культуры, наладжванне цывілізаваных адносінаў з рэлігійнымі арганізацыямі... Аднак прыярытэтнай, паводле яго слоў, з'яўляецца работа са сродкамі масавай інфармацыі.*

● **Адбылася тэлефонная размова паміж Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь Аляксандрам Лукашэнкам і прэзідэнтам Украіны Леанідам Кучмам.** Яны праінфармавалі адзін аднаго аб становішчы спраў у сваіх дзяржавах, аб эканамічных і палітычных працэсах. Аляксандр Лукашэнка і Леанід Кучма абмеркавалі перспектывы пашырэння беларуска-ўкраінскіх сувязяў з улікам дамоўленасцяў, дасягнутых у час рабочай сустрэчы прэзідэнтаў Беларусі і Украіны ў Гомелі.

● ***Паводле вынікаў апытання,*** *праведзенага ў канцы студзеня гэтага года лабараторыяй Андрэя Вардамацкага "НОВАК" па заказе "БДГ", цалкам падтрымліваюць задуму з аб'яднаннем Беларусі і Расіі 30,8 працэнта апытаных; яшчэ 28 працэнтаў — хутчэй падтрымліваюць, чым не. Паслядоўных праціўнікаў аб'яднання — 14 працэнтаў; яшчэ 11,2 працэнта схіляюцца да таго, што Беларусі, хутчэй за ўсё, варта заставацца незалежнай. Апошнія лічбы абнадзейваючыя. Да ўсяго, абнадзейвае і яшчэ адзін факт: у кіраўніцтве нашай краіны з'явіліся новыя акцэнты ў ацэнцы незалежнага статуса Беларусі, яе гістарычнага шляху.*

● **Прынята рашэнне аб адкрыцці на Беларускім тэлебачанні другога дзяржаўнага канала.** Хутчэй за ўсё, "БТ-2" заменіць вяшчанне Грамадскага расійскага тэлебачання, якое сёння нібыта бясплатна карыстаецца сеткамі, што належаць Беларусі. Хочацца спадзявацца, што і на "БТ-2" не будуць забывацца на беларускую мову.

● ***Сёлета першы нумар часопіса "Беларусь" выйшаў у свет на дзвюх мовах — беларускай і расійскай.*** *Хутка чакаецца нараджэнне "Беларусі" ў англійскім варыянце, які не будзе дубляваць беларуска-расійскія аналагі, а стане самастойным выданнем, разлічаным на азнаямленне замежных чытачоў з нашай краінай. Адно было б нонсэнсам: каб з цягам часу не знік беларускамоўны варыянт "Беларусі" і не застаўся толькі расійскі.*

● **У друку з'явілася інфармацыя,** што ў хуткім часе Нацыянальная бібліятэка можа пераехаць у раён Дражні, які аддалены ад цэнтра Менска, але канчаткова рашэння яшчэ не прынята. З упэўненасцю можна сказаць адно, што чытачы пацярпець не павінны. Капітальны рамонт адразу ўвесь будынак не ахопіць, таму кнігі будуць пакідаць кнігасховішча паэтапна і гэтак жа вяртацца. Унікальныя рукапісы і выданні ўвогуле не пакінуць Нацыянальную бібліятэку.

Падрыхтаваў В.Ш.

Беларускай мове абвешчана падтрымка?

Вялікае (у трох нумарах) інтэрв'ю Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь у газеце "Советская Белоруссия" выклікала павышаную зацікаўленасць у шырокіх колах грамадскасці нашай краіны. Яго ўважліва чыталі не толькі грамадзяне беларускай, так бы мовіць, ментальнасці, скіраванасці, але і тыя аматары "воссоединения" з вялікім усходнім суседам ажно да наступнага падзелу Беларусі на расійскія губерні, хто, ужо некамуфлюючыся, чыніць перашкоды існаванню самабытнасці, нацыянальнай адметнасці беларускага народа, у тым ліку адной з найважнейшых — мовы карэннай нацыі. Таму для апошніх як снег на галаву была заява Аляксандра Лукашэнкі, што "сцвярджэнне, быццам Беларусь "нарадзілася" ў 1918 годзе, некалькі прамалінейнае. У гістарычнай памяці нашага народа жывуць часы і Вялікага Княства Літоўскага... дастаткова моцнай і цывілізаванай дзяржавы еўрапейскага сярэдневечча. У гэтай даволі своеасаблівай краіне, — адзначыў далей Прэзідэнт, — беларусы адыгрывалі прыкметную ролю не толькі як хлебаробы, але і як вайскоўцы, дзяржаўныя дзеячы, юрысты, вучоныя. Вялікае Княства стварыла сваю непаўторную цывілізацыю..."

Асобна і вельмі выразна закрануў Прэзідэнт у згаданым інтэрв'ю цяперашні стан беларускай мовы, якая ва ўсіх канстытуцыях зацверджана дзяржаўнай і маючай роўныя правы з расійскай. "Зараз я знаходжу, — адзначыў Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка, — пэўныя перакосы ў бок скарачэння сферы ўжывання беларускай мовы. Будзем прымаць меры..."

У сваю чаргу зусім нядаўна прызначаны намеснікам кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта па грамадска-культурных пытаннях Іван Пашкевіч на сваёй першай прэс-канферэнцыі таксама паведаміў журналістам, што будзе аказана спрыянне беларускай культуры і мове, каб яны функцыянавалі ў поўным аб'ёме.

Важка абвешчана. Цяпер трэба чакаць, як усё гэта будзе праводзіцца ў жыццё. У першую чаргу многае ўжо стане зразумелым па тым, ці будзе працягнута фінансаванне газеты Таварыства беларускай мовы "Наша слова". Выклікала вялікае здзіўленне, калі ранейшы старшыня Дзяржкамдруку РБ нібыта ў мэтах зберажэння сродкаў практычна толькі адну невялікую культурна-асветніцкую газету "Наша слова" ахвяраваў на алтар гэтай самай "эканоміі". У той жа час знайшоўшы магчымасць фінансава падтрымаць ... новы расійскамоўны часопіс "Всемирная литература", выдаткі на які намнога вышэйшыя за сціплую датацыю на "Наша слова". Нейкая дзіўная "эканомія". Ужо не кажучы пра тое, што часопіс "Всемирная литература" выдаецца на расійскай мове і сваім начыннем нагадвае варыянт часопіса "Нёман". У Маскве даўно выходзіць шырокавядомы часопіс з магутным корпусам высокакласных рэдактараў і перакладчыкаў — "Иностранная литература", які выпісваюць і чытаюць у Беларусі.

Як бы там ні было далей, заклікаем усіх, хто неабыякавы да існавання "Нашага слова", дапамагчы разгарнуць шырокую падпіску на газету на другі квартал. Падкажыце сябрам, знаёмым, што ёсць такая газета. Спадзяёмся, што нарэшце стануць больш актыўнымі па арганізацыі падпіскі і мясцовыя суполкі ТБМ.

А яшчэ не будзе лішнім, калі сябры "Нашага слова" напішуць лісты ў яго падтрымку на адрас: Менск, Дом урада, віцэ-прэм'еру Уладзіміру Васільевічу Русакевічу. Ці каму іншаму з прадстаўнікоў вышэйшага кіраўніцтва Рэспублікі Беларусь. Лепей выслаць паштовую картку з кароткім адпаведным тэкстам.

Рэдакцыя.

Згадкі

Успомнілі братоў Луцкевічаў

Два браты Луцкевічы — Іван (1881 — 1919) і Антон (1884 — 1946) пакінулі адметны след у гісторыі Беларусі. Абодва выдатныя беларускія грамадскія і культурныя дзеячы, уваходзілі ў склад кіраўніцтва Беларускай сацыялістычнай грамады. Антон — вядомы ў беларускай літаратуры крытык і публіцыст, Іван — адзін з арганізатараў і правадыроў нацыянальна-адраджэнскага руху пачатку XX стагоддзя. Ініцыятар стварэння газет на беларускай мове "Наша доля" і "Наша ніва". Вось што пісаў пра яго сучаснік: "Не было беларускае ўстановы, дзе б не было Івана Луцкевіча, а мала таго — не было ўстановы, якая бы заснавалася без яго ўчасьця і ў якую ён не ўлажыў частку свайго гарачага духа" (Аляхновіч Ф. Беларускі тэатр. Вільня, 1924.) Менавіта І.Луцкевіч знайшоў у 1915 годзе і апісаў рэлігійную кнігу беларускіх татараў "Аль-кітаб". Галоўная ягоная заслуга — заснаванне ў 1910 — 1914 гг. у Вільні Беларускага музея на аснове сабранай ім калекцыі скарбаў нацыянальнай культуры. Пазней паўстаў Віленскі беларускі гісторыка-этнаграфічны музей імя І.І.Луцкевіча (існаваў у 1921 — 1945 гг.)

Выдатным братам-асветнікам і была прысвечаная вечарына ў Дольнай зале менскага Чырвонага касцёла св. Сымона і св. Алены, дзе месціцца тэатр аднаго акцёра "Зьніч". Перад спектаклем "Віленскія мроі" выступіў аўтар дакументальнай аповесці "Антон Луцкевіч" Анатоль Сідарэвіч.

"Віленскія мроі" — монаспектакль паводле ўспамінаў Юльяны Вітан-Дубейкаўскай (з роду Мэнке) і вершаў Надзеі Артымовіч. На сцэну выйшла Галіна Дзягілева і спачатку загаварыла па-нямецку. Бо Юльяна ж Вітан-Дубейкаўская — віленская немка, якая спрычынілася да беларускага Адраджэння. Іван Луцкевіч — лірычны герой успамінаў, з якім Юльяну лучыла моцнае, узнёслае каханне. Яна стала сведкам стварэння музея. Смерць Івана ад сухотаў у 1919 г. у польскім горадзе Закапанэ перашкодзіла гэтаму рамантычнаму каханню аформіцца ў шлюб. Артыстка ў вобразе Юльяны апавядала пра пражытае з Іванам. Нібы душа даўно памерлай на зямлі Вітан-Дубейкаўскай была з гледачамі. Некаторыя з іх праслязіліся. Такое ўражанне стварыла і таленавітая Галіна Дзягілева, і музыка Алега Залётнева.

Мемуары "Мае ўспаміны" напісаныя ў 1953 г. у Нюрнбергу. Затым праз Лондан, Амерыку, Вільню рукапіс дайшоў да Беларусі. Пляменнік Івана Лявон Луцкевіч перадаў друкаваны тэкст Г.Дзягілевай.

У 1996 годзе (115-я ўгодкі нараджэння І.Луцкевіча, 75-я ўгодкі адкрыцця Беларускага музея імя І.Луцкевіча) адбылася прэм'ера спектакля. На маё пытанне, ці зняты ён на відэастужку, арганізатары адказалі, што пакуль урыўкі спектакля запісаныя толькі на радыё. Такім чынам, адсутнічае магчымасць паказаць яго па тэлебачанні. А ён таго варты.

Генадзь КАЖАМЯКІН.

Але!

МАЮЧЫ СВАЁ, ЧАПЛЯЮЦЦА ЗА ЧУЖОЕ

— Ну, дзядзька, як на смак, прызнайся.
— Паскудства, брат, і не пытайся.
Я. Колас. "Новая зямля".

І здзіўляе і не здзіўляе абсалютна бяздумнае стаўленне нашых журналістаў да Беларусі. Нават лепшыя з іх дазваляюць прыкрыя моўныя барбарызмы, слоўцы заходняга паходжання, але пераймаюцца чамусьці ... з Расіі. Гэта, пэўна, у іх ад дзяржаўнага двухмоўя. Пэўна, у іх гэта ад павышанай "інтэграцыйнасці"? Прыкладам, галаву гарадской улады пачалі называць чамусьці нейкім "мэрам". А старшага вертыкальнага па вобласці — "губернатарам" (!). Дык ужо і Беларусь гэтак неўспадзеўкі пачнуць абзываць "северо-западным краем"?

Але ж калі на тое, дык мы і свае добрыя назвы маем. Калі так ужо хочацца, то чаму б не назваць прадвадзіцеля вертыкальных "ваяводам". Вунь як яны за сваю ўладу ваявалі! А начальнік горада мог бы называцца, скажам, па-старажытнаму — "бургамістрам", а "начальнік сельсавета" — можа "стараста".

Сапраўды, як казаў напрыканцы 1996 г., вялікі патрыёт Каталуніі Джэрдзі Пуджэль, "без паняцця Радзімы нельга зрабіць нічога".

Мікола БУСЕЛ.
в. Дуброва.

У канцы студзеня Менск наведала місія Еўрапейскага саюза. Мэтаю візіту была падрыхтоўка даклада аб становішчы ў Беларусі, які мае быць абмеркаваны Радай міністраў ЕС. Сярод інфармацыяў, атрыманых заходнімі экспертамі, быў і падрыхтаваны супольна прадстаўнікамі Таварыства беларускай мовы і Таварыства беларускай школы даклад аб стане беларускамоўнай адукацыі ў краіне, тэкст якога друкуецца ніжэй.

ІНФАРМАЦЫЯ

аб парушэнні правоў грамадзянаў на атрыманне адукацыі ў беларускай мове

У Беларусі 74,5% грамадзян (паводле апошняга перапісу 1979 года) уважаюць беларускую мову за родную. Аднак у выніку дыскрымінацыі карэннага этнасу камуністычным рэжымам на працягу сямідзесяці гадоў беларуская мова была цалкам выціснутая з сферы сярэдняй спецыяльнай і вышэйшай адукацыі, а таксама значна абмежаваныя яе функцыі ў атрыманні сярэдняй адукацыі. Вывучэнне беларускай мовы ў якасці школьнай дысцыпліны стала неабавязковым.

Пасля таго, як былі ліквідаваныя апошнія беларускія школы ў гарадах і мястэчках Беларусі, на працягу больш за 20 гадоў ніводзін гарадскі вучань не навучаўся ў школе па-беларуску. На пачатку 80-х гадоў толькі сям'я Ліciцыных здолела дамагчыся, каб іх дачка вучылася ў школе па-беларуску. Яны дамагліся гэтага коштам свайго здароўя, а маці гэта каштавала жыцця. У 1982 годзе ў менскай 108-й школе адкрыўся першы невялікі беларускі клас. У гэты ж час сем'і некалькіх менчукоў вазілі сваіх дзяцей вучыцца ў бліжэйшыя сельскія беларускія школы. Пад ціскам дэмакратычнай грамадскасці, пачынаючы з 1987 года, савецкія ўлады змушаныя былі адкрываць адзінкавыя беларускія класы ў гарадах.

Пасля атрымання Беларуссю незалежнасці пачаўся натуральны працэс пераходу адукацыі на мову карэннай нацыі, якая стала дзяржаўнай.

З прыходам да ўлады Лукашэнкі афіцыйнымі ўладамі быў узяты курс на дыскрымінацыю беларускай мовы, у тым ліку і ў сферы адукацыі. Асноўны ўдар быў нанесены наступным чынам: многія школы, якія мелі статус беларускіх, цалкам ці амаль цалкам былі пераведзеныя на расійскую мову навучання.

Спосабы, якімі гэтага дамагаліся, нешматлікія:

— Звыкла адміністрацыя школаў адмаўляецца прымаць заявы ад бацькоў на навучанне на беларускай мове. У выпадку, калі бацькі усё ж здолеюць дамагчыся свайго, дык у пачатку школьнага года іх ставяць перад фактам: іх дзіця залічанае ў 1-ы клас з расійскай моваю навучання. Другой беларускай школы паблізу няма.

— Ужываецца і такі спосаб ліквідацыі класаў. Стараюцца зменшыць колькасць дзяцей у беларускім класе, а потым, спасылаючыся на нейкія інструкцыі, гавораць бацькам, што фінансавыя органы не дазваляюць фінансаваць малакамплектныя класы. Аб гэтым пісалася ў газетах:

"... Спачатку ў "беларускім" 5-м класе было усяго пяць вучняў... Неўзабаве і іншыя бацькі захацелі вучыць сваіх дзяцей на беларускай мове. Ды дарэмна! Клас ужо ліквідавалі. Як патлумачыў нам дырэктар, фінаддзел забараніў, таму што не хапала вучняў да 20..."

Газета "Звязда", верасень 1994 г.

Значная частка беларускіх класаў пераведзеная на расійскую мову з ініцыятывы адміністрацыяў школаў цынічна і жорстка. Звычайна, гэта суправаджалася адпаведнай псіхалагічнай апрацоўкай бацькоў, запалохваннем, распаўсюджваннем хлуслівых звестак аб тым, што няма беларускіх падручнікаў, няма настаўнікаў, здольных выкладаць па-беларуску і г.д. Вось фразы з лістоў бацькоў у дзяржаўныя органы і грамадскія арганізацыі з просьбамі абараніць іх і іхніх дзяцей у праве атрымаць адукацыю ў беларускай мове: *"...у канцы школьнага года ўсім дзецям выдалі падручнікі на расійскай мове. Такім чынам нам далі зразумець, што нашых дзяцей прымусова збіраюцца перавесці на расійскую мову навучання, альбо прымусіць сысці з гэтай школы...", "...ўсіх бацькоў вучняў чацвёртых класаў*

(Заканчэнне на стар.2.)

ІНФАРМАЦЫЯ

аб парушэнні правоў грамадзянаў на атрыманне адукацыі ў беларускай мове

(Заканчэнне. Пачатак на стар.1.)

настаўнікі раптам сталі прымушаць пісаць заявы на змену мовы навучання з беларускай на расійскую. У выніку доўгага жорсткага ўціску (у тым ліку і ў выглядзе тэлефонных званкоў дадому) частка бацькоў перапісвае свае папярэднія заявы, згаджуючыся з пераходам на расійскую мову навучання... нязгодныя аказваюцца ў стане выгнанцаў на сваёй зямлі, якім фактычна паказваюць на дзверы...”

Аб падобных выпадках пісала і прэса:

“...у 1994 годзе я аддаў сваю Вераніку - жыхарку незалежнай Беларусі—у Менскую беларускую гімназію 103... Дзіцяці падабалася вучыцца там, і задоўга да восені яна рыхтавалася ў другі клас: ранец, кніжкі, баціначкі, гольфікі... І толькі прыйшоўшы ў другі клас, я даведаўся, што гэта ўжо не беларуская гімназія, і выкладаць тут будуць усё па-расійску... Як гэткае можа быць на маёй радзіме, у маёй краіне. Пры адной думцы аб гэткім прыніжэнні пачынае калаціцца сэрца і сціскацца кулакі. Гэта называецца “равными возможностями”? Гэта называецца “свабодным выбарам”?...”.

Газета “Свабода”, кастрычнік 1995 г.

Бацькі, якія часта вялі шматмесячную барацьбу, у большасці выпадкаў дамагліся толькі частковага задавальнення сваіх патрабаванняў, таму што іх класы, звычайна, пераводзіліся на расійскую мову навучання, а дзяцей “няскораных” бацькоў збіралі ў адзін клас з усіх былых беларускіх. Некаторая частка бацькоў змушаная была забраць сваіх дзяцей з школаў і цяпер возяць іх у школы, дзе яшчэ не ліквідаванае беларускамоўнае навучанне. Гэта нябліскія школы. Многія ж бацькі проста не вытрымлівалі жорсткага ўціску і таго маральна-псіхалагічнага клімату ў школе, які ствараўся вакол іх дзяцей, і спынілі барацьбу.

Вось лічбы, што сведчаць аб ліквідацыі беларускамоўнага навучання. Больш 53% вучняў, якія ў 1994 годзе ў Менску вучыліся ў 1-х класах, за два апошнія гады пераведзеныя на расійскую мову навучання. 35% вучняў, якія ў 1994 годзе навучаліся ў другіх класах, пераведзеныя на расійскую мову. Падобныя ж лічбы і па іншых класах. У сталіцы Беларусі засталося дваццаць беларускіх школаў з агульнай колькасці 220 школаў.

У першую чаргу беларускамоўнае навучанне касуецца ў прэстыжных школах: гімназіях, спецыяльных англійскіх, фізіка-матэматычных, эканамічных. Такое катастрафічнае змяншэнне колькасці беларускамоўных вучняў — не стыхійная з'ява, а вынік мэтанакіраванай работы дзеля знішчэння беларускай школы.

Тэндэнцыя на знішчэнне беларускай школы пануе з невялікімі варыяцыямі па ўсёй краіне. Праз год пасля прыходу Лукашэнкі да ўлады ва ўсіх абласцях павялічылася колькасць школаў з расійскай моваю навучання, у тым ліку ў Гомельскай вобласці (з 14,5% да 60,3%), Віцебскай вобласці (з 18,3 да 42,7%), Магілёўскай вобласці (з 17,2% да 42,9%). У гэтых жа абласцях зменшылася колькасць школаў з дзвюма мовамі навучання: у Гомельскай вобласці (з 77,3% да 38,7%), Віцебскай вобласці (з 80,5% да 56,1%), Магілёўскай вобласці (з 80,7% да 55,1%).

У сельскай мясцовасці колькасць школаў з беларускай моваю навучання зменшылася на 91 школу, колькасць школаў з расійскай моваю навучання павялічылася з 67 да 219.

За мінулы 1996 год становішча беларускай школы яшчэ больш пагоршылася.

У табліцы даецца дынаміка прыёму ў першыя класы з беларускай моваю навучання (% ад агульнай колькасці дзяцей, што прыйшлі ў першыя класы) па абласцях за апошнія пяць гадоў (звесткі за 1996-1997 школьны год—неафіцыйныя, наша ацэнка).

	1992-1993 г.	1993-1994 г.	1994-1995 г.	1995-1996 г.	1996-1997 г.
г. Менск	48,3	58,6	58,0	19,5	11,0
Берасцейская	76,0	79,7	79,5	37,0	31,0
Віцебская	58,1	65,5	62,3	28,9	26,0
Гомельская	72,3	75,7	82,8	26,1	23,0
Гарадзенская	82,9	87,5	86,9	61,4	50,0
Менская	86,9	92,6	91,3	67,8	61,0
Магілёўская	53,0	72,8	65,1	25,8	23,0
Усяго	**68,5**	**75,3**	**76,0**	**37,9**	**33,0**

Што ж тычыцца сярэдняй спецыяльнай адукацыі і вышэйшай школы, дык у краіне няма практычна ніякіх магчымасцяў працягнуць адукацыю на беларускай. Сітуацыя тым больш парадаксальная, што большасць абітурыентаў, ад 50% да 80%, абрала для ўступных экзаменаў беларускую мову. Тыя нешматлікія факультэты, якія давалі магчымасць навучацца па-беларуску, пераводзяцца на расійскую мову. Дэканы, якія не падабаюцца цяперашнім уладам, здымаюцца з пасадаў: у Беларускім дзяржаўным універсітэце зняты з пасады насупераж волі выкладчыкаў і навуковай рады дэкан філалагічнага факультэта прафесар Плотнікаў, змушаны быў пайсці са сваёй пасады дэкан гістарычнага факультэта прафесар Шупляк.

У 1996 годзе не было выпушчана ніводнага падручніка на беларускай мове для вышэйшай школы па тэхнічных і іншых дысцыплінах. Запланаваныя раней да друку падручнікі зняты з плану выпуску дзяржаўных выдавецтваў.

Каб дамагчыся права на атрыманне вышэйшай адукацыі на беларускай мове, у Беларусі пачаты масавы збор подпісаў грамадзянаў. Сабраныя дзесяткі тысячаў подпісаў.

З усяго гэтага бачна, што палітыка Лукашэнкі скіраваная на паступовае і поўнае знішчэнне беларускай мовы на яе спрадвечнай тэрыторыі. У сувязі з тым надзвычай цынічна прагучалі словы, сказаныя ім на святкаванні 75-годдзя Беларускага дзяржаўнага універсітэта: “Сегодня у нас созданы оптимальные условия для свободного и естественного развития белорусского языка и белорусской культуры”.

Калі вас зацікавіць больш падрабязная інфармацыя, дык мы зможам яе прадаставіць.

Таварыства беларускай мовы імя Ф. Скарыны.

Пераклад з расійскай У. П.

Меркаванні

Падпіска на газету — таксама патрыятызм

“Наша слова” надрукавала заклік афарміць падпіску на другі квартал. Напамін своечасовы. Што да мяне, то я неўзабаве рушыў у сваё паштовае аддзяленне, каб зноў далучыцца да сваёй культурна-асветніцкай грамады.

Дарэчы, у мяне “Наша слова” амаль ніколі доўга не затрымліваецца, выключэнне — толькі некалькіх першых цяпер ужо рарытэтных нумароў 1990 года. Прачытаўшы чарговы нумар “Нашага слова” сам, я яго затым дару знаёмым, а то і спецыяльна пакідаю ў людных месцах, прапаную ў аўтобусах. Каб людзі маглі пазнаёміцца ды зацікавіцца адзінай на Беларусі культурна-асветніцкай штотыднёвай беларускай газетай, якая пастаянна і прафесійна адсочвае працэсы культурнага карыстання такім унікальным нацыянальным багаццем, як слова.

Скажу непрыемнае і ў адрас суполкі ТБМ імя Ф. Скарыны ў Баранавічах. Але вельмі шкада, што суполка практычна анічога не робіць дзеля прапаганды “Нашага слова” ў горадзе і раёне. Я прапаноўваў актывістам суполкі правесці Дзень “Нашага слова”, арганізоўваць нядзелі і дні падпіскі на яе, зрабіць газетную вітрыну, як гэта зрабілі камуністы з сваёй газетай “Товарищ”. Маўчанне. Дзівіць, што і на рэдкія свае мерапрыемствы тут ніколі актывісты ТБМ не праводзяць выставак газеты “Наша слова” нават па матэрыялах пра Баранавічы і Баранавіччыну. Сп. З. Сіцька ў “НС” № 6 паведаміў пра вечарыну, прысвечаную памяці Тамаша Зана. Узяць хоць бы згаданую вечарыну, калі падводзіліся вынікі віктарыны, прысвечанай Тамашу Зану. Нічога пра публікацыі ў “Нашым слове”. На падвядзенні ўручалі грашовыя ўзнагароды, кнігі, значкі. А маглі пераможцам уручыць і падпісныя квіткі на “Наша слова”. Аб гэтым я яшчэ раней гаварыў сябру ТБМ В. Сырыцы, калі ладзілі вечарыну памяці Яна Чачота, дзе мне ўручылі безыменныя кнігі... Сырыца тады прамаўчаў. А шкада, што актывісты ТБМ у Баранавічах не клапоцяцца аб пашырэнні шэрагаў падпісчыкаў на “НС” Па сабе мяркую, колькі газета дае карыснага. Дарэчы, даўно ўважліва сачу за творчасцю такіх аўтараў “Нашага слова” як В. Выхота, І Крэнь, З. Сіцька, Л. Раманенка, А. Мікалайчанка, А. Яскевіч, М. Пузіноўскі, У. Панада і іншых, якія валодаюць асаблівай таемнасцю ўжывання слова, пішуць доказна і займальна. Сур'ёзную праблематыку ўмее ўзняць Ул. Асінавец (Ул. Ас.) і некаторыя іншыя аўтары.

Мне падабаецца шматколернасць і шматграннасць думак аўтараў газеты. Гэтай якасці ў афіцыёзных выданнях амаль не відаць. Як тут не ўспомніць словы Пімена Панчанкі з 1988 года:

Мала ў Беларусі
Разумных гісторыкаў,
Якія любяць і ведаюць
Родную гісторыю.

Разумных гісторыкаў у нас не паболела, як і змагароў за роднае слова, родную літаратуру, нацыянальную самасвядомасць. Больш вызначылася пярэваратняў, нават ніколечкі не саромяцца, калі ім гавораць аб гэтым. Дык спецыяльна для іх успомнім неўміручыя радкі Пімена Панчанкі з яго верша “Не адцураюся, не адракуся”:

І вас тупалобыя
Душыцелі мовы,
Бог пакарае.
....
Станеце зноў жыхарамі
Паўночна-Заходняга краю...

Дык вось, сярод газет Беларусі, якія падтрымліваюць духоўнасць і годнасць народа, засталося няшмат выданняў. У іх шэрагу — “Наша слова”. Гэты штотыднёвік, мабыць, сёння амаль ці не адзіны выразнік шчырай любові і павагі да роднага слова, нацыянальных беларускіх каранёў. То як жа яго не падтрымаць тым, хто шануе Маці-Беларусь.

Міхась МАЛІНОЎСКІ,
правадзейны член Геаграфічнага таварыства,
г. Баранавічы.

Культурна-асветніцкая штотыднёвая беларуская газета
НАША СЛОВА
Our Word
Unser Wort
Naša Słowa

Падпісны індэкс 63865

ЗАСНАВАЛЬНІК: Таварыства беларускай мовы імя Францішка Скарыны

Газета зарэгістраваная ў Дзяржаўным камітэце Рэспублікі Беларусь па друку.
Рэгістрацыйнае пасведчанне **№ 83.**

Рэдакцыйная калегія:
Эрнэст ЯЛУГІН — **галоўны рэдактар**
Лявон БАРШЧЭЎСКІ,
Янка БРЫЛЬ,
Анатоль БУТЭВІЧ,
Радзім ГАРЭЦКІ,
Ніл ГІЛЕВІЧ,
Вольга КУЗЬМІЧ,
Уладзімір ЛАМЕКА,
Уладзімір ПАНАДА,
Зміцер САНЬКО,
Здзіслаў СІЦЬКА,
Алег ТРУСАЎ,
Генадзь ЦЫХУН.
Адказны сакратар — Уладзімір АНІСКОВІЧ.
Кампутарны дызайн — Ірына ДЗІВІНА.
Кампутарны набор: Тамара АЎСЯННІКАВА, Вера ВАРАНЦОВА.
Тэхнічны рэдактар Валянціна КАРАТКЕВІЧ.
Карэктары: Жанна КАЗЛОЎСКАЯ, Генадзь КАЖАМЯКІН.

Адрас рэдакцыі: 220029, г. Менск, вул. Чычэрына, 1, 3-і паверх.
Тэлефон: 233-17-83.

Кампутарнае забеспячэнне пры падтрымцы Беларускага аддзялення Фонду Сораса.

Жыццё Таварыства

“...УСІМ, ХТО НАЗЫВАЕ

Першую вышэйшую адукацыю Данат Яканюк атрымаў у кансерваторыі, якую скончыў у 1969 годзе. У 1971 годзе ён — скрыпач сімфанічнага аркестра — перайшоў у рэдакцыю музычных праграмаў Беларускага радыё, дзе займаў пасады рэдактара, старэйшага рэдактара і каментатара. У 1977 годзе паступіў у аспірантуру Інстытута этнаграфіі і фальклору Акадэміі навук Беларусі, потым працягнуў навучанне ў маскоўскім інстытуце мастацтвазнаўства, дзе ў 1982 годзе атрымаў дыплом сацыёлага і філосафа. Кандыдат філасофскіх навук. З 1984 года працаваў загадчыкам аддзела сацыялогіі Дзяржтэлерадыё Беларусі, з 1986 — намеснікам галоўнага дырэктара Дырэкцыі праграмаў БТ.

Але чытачам “Нашага слова” ён вядомы не як выканаўца класічнай музыкі ці чыноўнік тэлерадыёкампаніі, а як стваральнік і кіраўнік “Тэлесябрыны”. Гэткую назву маюць і цыкл падрыхтаваных ім за апошнія гады тэлепраграмаў, і створаная работнікамі тэлевізіі каля пяці гадоў таму суполка ТБМ, якую ўзначальвае ён жа.

Прадстаўляем увазе чытачоў гутарку са сп. Д. Яканюком нашага карэспандэнта.

— Што прывяло Вас у Таварыства?

— Усведамленне сваёй прыналежнасці. У 80-х гадах я, як і многія іншыя, задумаўся — хто я? Я выхоўваўся, вучыўся і жыў у расійскамоўным асяроддзі, але жыццёвы досвед, набытыя веды і праца гаварылі, што я, нягледзячы на тое, што гавару па-расійску, належу да іншай культуры — беларускай. Гадоў дзевяць таму я папрасіў калегаў і супрацоўнікаў: тыя, хто могуць, хай звяртаюцца да мяне па-беларуску. Нікога гэта асабліва не здзівіла, бо канец васьмідзесятых быў часам вялікіх зменаў, што закранулі ўсе сферы жыцця. Да таго ж, нашым тагачасным кіраўніком быў Генадзь Бураўкін, які шмат зрабіў для таго, каб беларуская тэлевізія мела беларускае аблічча і ў камуністычнай дзяржаве.

Калі стваралася Таварыства беларускай мовы, мы, яе прыхільнікі, увесну 1991 года зарэгістравалі сваю суполку ў тэлевізіі. Канешне, гэта быў нонсэнс — у дзяржаўнай арганізацыі ствараць суполку у абарону нацыянальнай мовы. Але ў той хваравітай дзяржаве патрэба ў гэтым была. Таму на нашую суполку глядзелі нават, як на радыкальную апазіцыю Бураўкіну, якога да яе стварэння ці мала хто лічыў непатрабавальным у пытаннях мовы.

— Якія мэты ставіла перад сабою вашая арганізацыя?

— Найперш — стварэнне тэлепраграм і правядзенне праз іх ідэі адраджэння нашай мовы і культуры. Мы хацелі дапамагчы людзям усвядоміць іх прыналежнасць да адзінага народа, да яго спадчыны. Мы хацелі, каб людзі адчулі прыгожосць сваёй мовы.

— Але ж вашыя праграмы ніяк не выглядалі на прапагандысцкія...

— Я бачыў шмат спробаў агітацыі і прапаганды. Можна называць мову самай мілагучнай і самай прыгожай у свеце, можна спасылацца на класікаў літаратуры, дзеячаў культуры ці палітыкі — як колішніх, так і сучасных, якія ёй карыстаюцца... Але мы абралі іншы шлях. Мы імкнуліся паказаць вартасці нашай культуры, нашага мастацтва, асабістыя якасці людзей, якія з'яўляюцца іх стваральнікамі і адначасова — носьбітамі нашай мовы. Бо станоўчыя эмоцыі і прыхільнасць людзей выклікаюць не лозунгі і заклікі, а прыгажосць. Мы хацелі паказаць вартасці не проста мовы, а створанай у ёй культуры Беларусі. Мы імкнуліся выклікаць у людзей жаданне далучыцца да яе.

— Як гэта выглядала?

— У 1991-1992 гадах Беларуская тэлевізія ўпершыню дала эфіру час святу Калядаў. Тады гэта выглядала, як рэвалюцыя: тэлевізія, якая ўвесь час свайго існавання была часткаю дзяржаўнага прапагандысцкага апарату, у адзін дзень перайшла ад рэкламавання светлай камуністычнай будучыні да разгляду каштоўнасцяў хрысціянскай веры і народнай культуры.

Але першая сапраўды значная нашая акцыя адбылася на Дзяды наступнага 1992-га года. Кіраўніцтва ставілася да яе з пэўнай перасцярогаю і недаверам, але саступіла. І мы зрабілі дванаццацігадзінную тэлепраграму, якая ішла ад ранку да вечара. Нават тыя праграмы і інфармацыйныя выпускі, якія непазбежна перапынялі яе, мелі спецыяльныя падводкі, каб канцэптуальна ёй адпавядаць. Гэта было ўпершыню: адмысловая праграма, каля шасці гадзінаў наўпростага эфіру ў дзень, які яшчэ год таму не быў дзяржаўным святам і які пасля падзеяў 1988 года ва ўсіх выклікаў вельмі акрэсленыя асацыяцыі.

Разумеецца, тысячы і тысячы людзей дагэтуль не толькі не хацелі і баяліся згадваць аб мінулым сваім і сваіх родных. Тысячы з іх не маглі нават пайсці ў царкву, каб паставіць свечку ў памяць аб памерлых ці без віны забітых. Гэтую справу ўзялі на сябе мы, і на нас абрынулася лавіна тэлефонных званкоў з усёй краіны. Потым гэтыя тэлефанаванні стварылі базу даследавання грамадскай думкі, якое таксама праводзілі мы.

У гэты дзень “Тэлесябрына” здолела ўпершыню не проста далучыць людзей да тэлеэфіру, але і злучыць іх, дапамагчы ім усвядоміць сваю прыналежнасць да адной супольнасці, зразумець, што лёсы іх ды іх сем'яў ёсць часткамі адзінай гісторыі нашага народа. Мы рабілі тэлемасты паміж студыямі ў сталіцы і розных рэгіёнах, удзельнікамі якіх рабіліся самыя розныя людзі. У эфіры гучала адпаведная гэтаму дню музыка розных жанраў — ад беларускага фальклору да еўрапейскай класікі. Мы рабілі ўсё, каб пазбавіць гэтае сумнае свята, агульнае для ўсіх, аблічча правінцыйнасці, вясковасці і паказаць людзям: Дзяды — частка еўрапейскіх традыцыяў у культуры Беларусі.

Потым былі іншыя праграмы, прымеркаваныя да іншых святаў народа, якія ў незалежнай Беларусі сталі дзяржаўнымі: Вялікадня, Калядаў. Але канцэпцыя іх захавалася: традыцыйнае мастацтва, публіцыстыка ды класічнае мастацтва — і ўсё гэта па-беларуску ў адкрытым эфіры.

З 1992 года стваральнікі “Тэлесябрыны” не маюць святочных дзён. У гэты час яны працуюць у адкрытым эфіры дзеля таго, каб ператварыць тэлегледачоў ва ўдзельнікаў адной падзеі, якая адбываецца ў іх на вачах і з іхнім удзелам, каб даць ім магчымасць выказаць свае думкі і пачуцці. Яны працуюць дзеля таго, каб людзі з тэлевізійным экранаў адчулі сваю прыналежнасць да адзінай нацыі.

— Ці чулі стваральнікі “Тэлесябрыны” крытыку ў свой бок?

— Цяпер шмат гавораць аб нежаданні беларусаў гаварыць сваёй мовай і захоўваць сваю культурную адметнасць. Але тады было ўсяго некалькі званкоў з заўвагамі пра нашае нежаданне гаварыць па-расійску і абвінавачваннямі з гэтай прычыны ў нацыяналізме. Але ж тая была нашая пазіцыя: беларуская дзяржаўная тэлевізія вядзе свае праграмы па-беларуску. Госці нашых праграмаў таксама гаварылі сваімі мовамі — англійскай, літоўскай, расійскай. Мы рабілі ім беларускі пераклад, і гэта выклікала не перашкоды разуменню праграмаў, а павагу да нашай мовы.

Калі ўжо гаварыць пра ацэнку дзейнасці нашай суполкі іншымі, дык давалі яе не толькі староннія людзі, але і кіраўнікі ТБМ. З іх боку былі захады да таго, каб мы ў сваёй працы больш увагі надавалі менавіта мове, яе прапагандзе і навучанню ёй. Магчыма, рацыя ў гэтым была — кароценькія сюжэты з тлумачэннем, напрыклад лексікі слоўніка Ластоўскага ці іншых старых выданняў, маглі б прыцягнуць цікаўнасць. Але ж мы не хацелі займацца дыдактыкай, тым больш, што перадачу, прысвечаную выключна мове — “Роднае слова”, — ужо вёў Уладзімір Содаль. Замест агітацыі на карысць мовы ці навучання ёй мы імкнуліся ствараць беларускамоўныя праграмы, цікаўныя шырокаму колу гледачоў, нават для той большасці, якую не хвалявалі праблемы нацыянальнага адраджэння.

Нашая дзейнасць была сталым эксперыментам, напрацоўкай новага. У свой час мы рабілі серыю праграмаў “Імправізацыя апоўначы”, “Будзьце з намі”. Гэта быў сінтэз некалькіх відаў мастацтва: імправізацыі музычнай, відовішчнай — студыйнай з накладаннем знятых раней відэасюжэтаў, публіцыстычна-паэтычнай — у праграмах бралі ўдзел беларускія літаратары, мастакі, музыканты, палітыкі...

— На Ваш погляд, плён з гэтага быў большы?

— У нашым грамадстве існа-

З нагоды

Перад мовай роўныя і біскуп, і селянін...

У сталічным Доме літаратара адбылася прэм'ера дакументальных фільмаў, адзін з якіх прысвечаны пісьменніку, грамадскаму дзеячу, былому галоўнаму рэдактару Беларускай энцыклапедыі Барысу Іванавічу Сачанку ("Апошні сон Барыса Сачанкі", аўтар сцэнарыя Г.Багданава, рэжысёр М.Князеў, аператар Л.Слобін), а другі, фільм-роздум, прысвечаны гістарычнаму лёсу беларускай мовы (аўтар сцэнарыя А.Лойка, рэжысёр і аператар Ю.Гарулёў). Фільмы гэтыя кароткія, па дзесяць—дваццаць мінут. Што ж удалося за такі час сказаць іх стваральнікам?

З успамінамі пра Барыса Сачанку ў фільме выступілі яго жонка Тамара Андрэеўна, браты Іван і Пятро, дачка Святлана, пісьменнік Максім Лужанін. Іван Іванавіч прыгадаў ваеннае дзяцінства, а менавіта той дзень, калі немцы палілі іх вёску Вялікі Бор разам з яе хворымі, калекчанымі і старымі жыхарамі ("валіў чорны дым і пахла гарэлым мясам"), а ацалелае насельніцтва, у тым ліку і іх сям'ю, гналі да станцыі Васілевічы, адкуль у таварных вагонах павезлі ў Германію. У дарозе будучы пісьменнік ледзь не загінуў: азвярэлы немец хацеў яго зарэзаць. Гэты жудасны ўспамін ілюструюць не меней жудасныя кадры з нямецкай хронікі: навідавоку гарыць, палае адна са шматлікіх беларускіх хатынаў. Запомніўся і аповяд Тамары Андрэеўны пра мужа: як сустрэла яго ўпершыню на навагоднім вечары ва ўніверсітэце. У студэнцкім асяроддзі ён выглядаў звычайным, простым і сімпатычным хлопцам. Яны адразу пасябравалі. "Душа Барыса заўсёды балела з-за бядотнага стану роднай мовы, — казала Тамара Андрэеўна. — У часы перабудовы з групай пісьменнікаў ён апантана працаваў над Законам аб мовах. Пасля расказваў, як на пасяджэннях ЦК даводзілася бараніць гэты закон ад тых беларусаў, што выступалі супраць яго прыняцця і якім рускія па нацыянальнасці чыноўнікі казалі: "Як гэта вы, беларусы, выступаеце супраць такога патрэбнага для вас закона!" Тамара Андрэеўна адзначала, што Барыс Сачанка прадчуваў свой хуткі зыход з зямлі. У чэрвені, не чакаючы восені, ён абрэзаў свой сад, а ўначы сасніў, што з абрэзанага голля склаў вялікі лоўж, каб спаліць (адсюль і назва фільма: "Апошні сон Барыса Сачанкі").

Стваральнікі стужкі выкарысталі дакументальныя кінакадры, якія паказваюць пісьменніка ў час яго гутаркі з М.Лужаніным, пазнаёмілі гледачоў з сарака яго кнігамі, пры дапамозе фотаздымкаў нагадалі аб сяброўскіх сувязях з І.Мележам, В.Быкавым, Р.Барадуліным, Я.Сіпаковым, І.Чыгрынавым ды іншымі пісьменнікамі.

З'яўленне ў фільме "Ад прадзедаў спакон вякоў" другога вялікага беларуса Льва Міхайлавіча Шакуна выклікала ў гледачоў пачуцці вялікага шкадавання і разам з тым радасці ад сустрэчы з ім, жывым. Як і Барыс Сачанка, Леў Шакун заўчасна пакінуў сваё служэнне роднай культуры і пайшоў з жыцця повен нядзейсненых задум. Падрыхтаванае ім для фільма незадоўга да смерці выступленне прагучала з экрана як запавет жывым: "Любіце, шануйце і беражыце родную мову!" "Для кожнага народа яго мова — найкаштоўнейшы скарб, — казаў Леў Міхайлавіч. — Тут ён знаходзіць вельмі многа карыснага для сваёй душы, тое, што яго кранае, хвалюе, таму што ў мове закладзена вялікая мудрасць, вялікая назіральнасць чалавека". Далей ён расказаў пра гістарычныя шляхі беларускай мовы, яе помнікі, напісаныя ад рукі, і помнікі-старадрукі, па багацці якіх Беларусь займае адно з першых месцаў сярод славянскіх культур; прасачыў пераход ад царкоўнаславянскай мовы, якой, прыкладам, карыстаўся Кірыла Тураўскі, на новую літаратурна-пісьмовую мову, якая склалася ў XIV — XV стагоддзях і дала нам Скарыну. Размову пра каштоўнасць і значэнне роднай мовы ў жыцці чалавека працягвалі пробашч касцёла св. Сымона і Алены Уладзіслаў Завальнюк, мастак Уладзімір Басалыга, настаўнік роднай мовы і дырэктар Гудзевіцкага музея Алесь Белакоз. І ў кабінеце навукоўца, і ў касцёле святара, і ў майстэрнях мастакоў, і ў вясковым музеі ішла гаворка на адну і тую ж тэму: захаванне і зберажэнне нацыянальнай мовы беларусаў. Выказваючы свае адносіны да праблемы, ксёндз Завальнюк цытаваў Яна-евангеліста ("напачатку было Слова. І Слова было ў Бога. І Богам было Слова"), а таксама пасланне св.Паўла да карынфіян, у якім гаворыцца аб значэнні роднай мовы для чалавека: "Бо калі я малюся на незнаёмай мове, то хоць дух мой і моліцца, але розум мой застаецца бясплодным". У пасланні сцвярджаецца, што пастыры павінны маліцца на роднай мове народа, бо інакш, "калі ты будзеш добраслаўляць духам, дык той, хто стаіць на месцы простага чалавека, як скажа "амінь"? Бо ён не разумее, што ты кажаш". Святар закрануў пытанне друку і друкарняў і адзначыў:"Бібліі на беларускай мове мы яшчэ не маем. Гэта ўсё кнігі, якія мы атрымоўваем з-за мяжы. І таму Слова Божае, калі яно будзе гучаць у сваёй велічы, чысціні, такой паўнаце беларускай мовы, яно прынясе нам радасць, яно будзе нас ачышчаць і мы тады таксама, як кожны народ у свеце — ці то ў Еўропе, ці то ў Афрыцы, ці то ў ЗША — адчуем гэту паўнату і веліч сваёй мовы. Няхай добры Бог дапамагае нам ва ўзрастанні духоўным, а Маці Божая мае нас і ўсю Беларусь у сваёй апецы". А.Белакоз спыніўся на пытанні вывучэння роднай мовы ў школе. На яго думку, спачатку дзяцей трэба знаёміць са словамі, якія называюць блізкіх асоб, навакольныя мясціны, вядомыя з'явы. Пачынаць знаёмства трэба са слоў *мама*, *тата*, назваў свайго сельсавета, сваёй рэспублікі, а тады ўжо звяртацца да слоў *Масква* або *Кіеў*. Вельмі натуральна, у працэсе экскурсіі па музеі, гучыць апавядане старога настаўніка пра гістарычны лёс роднай мовы, "на якой 500 — 600 год назад гаварылі ўсе — і біскупы, і сяляне".

Фільм "Ад прадзедаў спакон вякоў" атрымаўся лірычным і хвалюючым. Ён кранае прыгажосцю краявідаў, духоўнай прыгажосцю сваіх герояў — святара, вучонага, настаўніка, мастака, прыгажосцю роднага слова, якое гучыць з іх вуснаў і з вуснаў чытальнікаў мастацкіх тэкстаў, прысвечаных беларускай мове. Шкада толькі, што ў ім не згадана роля ТБМ імя Скарыны ў адраджэнні беларускай мовы на сучасным этапе. У абмеркаванні фільмаў прынялі ўдзел пісьменнікі і навукоўцы Г.Далідовіч, І.Саламевіч, А.Марачкін, В.Красней, М.Савіцкі, мастак У. Басалыга. Па першым фільме іх думкі зводзяцца да наступнай высновы: Добра, што з'явіўся фільм пра Сачанку, хай сабе і малюпасенькі. Ён — першая цаглінка ў стварэнні вялікага фільма пра жыццё і дзейнасць гэтага славутага беларуса, фільма, у якім будуць выкарыстаныя багаты фактычны і гістарычны матэрыял, яго публічныя выступленні, выступленні па радыё і тэлебачанні, дакументальныя стужкі, якія дазволяць нам убачыць і пачуць Сачанку ў шмат якіх сітуацыях. Сачанка працаваў на беларускі рэнесанс, які людзі будуць доўга помніць, а мы, яго прадстаўнікі, будзем працаваць на тое, каб гэты час вярнуўся. Сачанка стаіць на асобым уліку ў нашай нацыі, талерантнай і таленавітай, ён дбаў аб тым, каб беларусы перад сусветнай грамадскасцю выглядалі прыстойна і каб пашыралася іх мова і культура (Саламевіч, Марачкін, Красней). Асобная думка М.Савіцкага: фільму не хапае філасофскай заглыбленасці і мастацкага асэнсавання тэмы. Архіўныя матэрыялы тычацца толькі нямецкага боку, а гістарычная расійская і савецкая акупацыі абыдзены. Не паказаны адмоўныя з'явы партызаншчыны ў Другой сусветнай вайне.

Фільм пра мову абмяркоўваўся больш энергічна і прынцыпова. На думку А. Марачкіна, ён занадта ідылічны, спакойны, бесканфліктны. А нам патрэбен фільм-крык: "Мова гіне!" Ніл Гілевіч першы пракрычаў гэтыя словы. Пракрычаў ён іх і зараз, апублікаваўшы адкрыты ліст расійскай інтэлігенцыі. У фільме павінна ісці гаворка пра сучасны трагічны стан, у якім апынулася наша мова, пра тое, што яе цураюцца і Прэзідэнт, і яго чыноўнікі.

На думку М.Савіцкага, фільм разлічаны на інтэлігенцыю з рэзервацыі, "такую, як мы з вамі". Ён ставіць філасофскія праблемы, дэманструе цудоўныя пейзажы, а трэба, каб у ім просты чалавек убачыў сябе збоку і задумаўся, чаму ён такі. Трэба было паказаць у фільме знішчэнне беларускіх школ у рэспубліцы — пры Машэраве і цяпер, паказаць слёзы бацькоў, якія ў мінулым годзе змагаліся ў Менску за беларускія класы.

В.Красней ацаніў фільм добра. На яго думку, у мастацкім плане ён не выклікае пярэчанняў і абуджае эстэтычныя пачуцці, а па зместу адпавядае пастаўленай задачы: паказаць вытокі беларускай мовы і яе прыгажосць. "Прыгажосць уратуе свет, а фільм пра гэта", — падкрэсліў спадар Красней.

Ірына КРЭНЬ.

Чыталі?



Так называецца кніга, нядаўна выпушчаная з друку выдавецтвам "Беларуская энцыклапедыя". Гэтая кніга выйшла ўжо пасля смерці яе аўтара — доктара мастацтвазнаўства, прафесара Міхаіла Кацара (1906 — 1995), імя якога назаўсёды ўвайшло ў гісторыю беларускай навукі і культуры.

"Працы М.Кацара многім адкрылі вочы на тое, што мастацтва Беларусі, аказваецца, бярэ пачатак не з 1917 года, што ў яго старажытныя карані, еўрапейскі ўзровень і самабытныя нацыянальныя адметнасці... Вядома, пры сённяшнім узроўні навуковай думкі многія разважанні аўтара здадуцца досыць спрэчнымі", — напісана ў прадмове да кнігі.

Але спрэчнымі могуць падацца якраз гэтыя словы. Бо аўтарскія трактоўкі сабраных матэрыялаў займаюць у кнізе няшмат месца. Большасць жа яе старонак аддадзеная сабраным М.Кацарам у 1934 — 1941 гадах — у маладым яшчэ веку — выявам твораў традыцыйнага беларускага мастацтва і тлумачэнням іх зместу іх жа аўтарамі, якія ў той час мелі па 70 — 80 гадоў. Гэта азначае, што базай кнігі сталі творы народных майстроў, народжаных у сярэдзіне мінулага стагоддзя, тых, што захоўвалі традыцыйнае мастацтва ў выглядзе аўтэнтычным, свабодным ад чужых яму ўплываў.

У.П.

Жыццё Таварыства

...СЯБЕ БЕЛАРУСАМІ"

вала і яшчэ існуе нейкае ўзвышанае стаўленне да тэлевізіі, павага да яе. Людзі давяраюць таму, што бачаць на экране. Гэткім чынам абыякавай да ўсяго большасці мы даводзілі: існуе вялікая культура, маючая глыбокія гістарычныя карані. Беларушчына — гэта не толькі фальклор, ручнікі і крытыя саломаю хаты. Гэта — прыналежнасць да Еўропы. Веданне таго, што ў самай вядомай сваёй кнізе Рабле ў спісе найбольш уплывовых краінаў Еўропы згадаў і дзяржаву нашых продкаў, дае падставы ганарыцца сваім мінулым. "Мы — нашчадкі стваральнікаў гэтай дзяржавы", — стала паўтаралі і паўтараем мы у сваіх праграмах.

Увагу людзей, магчыма, прыцягнуць, не паўтараючы лозунгі, хаця б і такія актуальныя, як адраджэнне мовы і культуры, а прапануючы ім нешта такое, чаго не могуць прапанаваць іншыя. А такой мовы, такога мастацтва і такой яго трактоўкі, якія рабілі мы, не было больш нідзе.

Даследаваннямі плёну нашай працы я як сацыёлаг займаўся два з паловаю гады. Аказалася, аўдыторыя перадачаў "Тэлесябрыны" была вельмі значнай: да трох з паловаю — чатырох мільёнаў гледачоў. Таварыства беларускай мовы, сябрамі якога мы з'яўляемся, ніколі не ахапляла сваім уплывам такую колькасць грамадзян нашай краіны.

— Дзяржава падтрымвала ініцыятывы прадстаўнікоў грамадскай арганізацыі?

— Скажам так: не, хаця і не стрымвала. Але я памятаю прыніжэнне, якое адчуў, калі хадзіў па кабінетах, жадаючы праводзіць нашыя праграмы праз каштарыс дзяржтэлерадыё. Сродкаў на рэалізацыю ініцыятываў "Тэлесябрыны" папросту не было.

— Іх дало ТБМ?

— Канешне ж, не. Таму даводзілася звяртацца да розных фондаў, камерцыйных фірмаў, рэклама якіх змяшчалася ў праграмах і якія аплачвалі ўдзел у праграмах выканаўцаў высокага класа.

— Гэта стварала для Вас праблемы?

— Мы, калі з энтузіязмам ладзілі ў адкрытым эфіры святочныя праграмы, дзейнічалі як работнікі дзяржаўнай установы ў імя дзяржаўных інтарэсаў. Але адначасова мы рабілі гэта і для сябе. Нашае жаданне аб'яднаць вакол "Тэлесябрыны" людзей, блізкіх поглядамі, было нашай прыватнай ініцыятывай. Мы хацелі прыцягнуць увагу іншых да эстэтыкі беларускай культуры, да месца ў ёй нашай мовы. Мы, ствараючы свой калектыў і свае праграмы, імкнуліся спрыяць таму, што называюць беларускім Адраджэннем. Але замест заняткаў творчасцю я мусіў займацца здабываннем грошай.

Іншыя праблемы стварала тое, што мы, работнікі дзяржаўнай тэлевізіі, мусілі кіравацца рэкамендацыямі кіраўніцтва, якія, па сутнасці, адлюстроўвалі ранейшы савецкі яго светапогляд. Але ж без спрыяльнага да сябе стаўлення тэхнічнага кіраўніцтва Дырэкцыі праграмаў існаваць нам было б зусім немагчыма. І тут нам дапамагла сфармаваная намі ж грамадская думка. І не думаю, каб калі-небудзь маглі быць скасаваныя перадачы, прыўрочаныя да падзеяў, якія адзначае кожны беларус. Таму мяняўся склад "Тэлесябрыны", пераглядалася яе канцэпцыя, але захавалася галоўнае: яе адкрытасць, яе еўрапейскасць і яе мова.

— Чым займаецца вашая суполка цяпер?

— На тэлевізіі мы вядзём два цыклы праграмаў. Першы — "Лёс мой і надзея" — прысвечаны праблемам сацыяльнай рэабілітацыі інвалідаў. Нягледзячы на тое, што з адраджэнскай тэматыкай ён не мае нічога агульнага, мы ў ім прапагандуем каштоўнасці беларускай культуры, самі карыстаючыся беларускай мовай і заахвочваючы да таго ўдзельнікаў нашых перадачаў. Другая нашая справа — працяг цыклу праграмаў, прымеркаваных да святаў — Дня Волі, Калядаў, Вялікадня ды іншых. Ёсць яшчэ адзін цікавы праект — "Беларусы ў свеце".

— Ён прысвечаны эміграцыі?

— Не. Гэта — спроба прапаганды нашай краіны ў свеце праз яе мастацтва. Тут нам ёсць чым ганарыцца: узровень нашых выканаўцаў класічнай музыкі нічым не горшы, чым у свеце. І мы ўжо здзейснілі некалькі сваіх задумак, напрыклад, наладзілі паездку камернага аркестра музычнага ліцэя пры кансерваторыі ў Германію. Запісаныя намі выступленні гэтага аркестра маглі бачыць тэлегледачы і Германіі, і Беларусі.

— У падобных справах Вы выступаеце ў якасці прадзюсера?

— Калі ёсць патрэба — так. Трэба разумець, што прапаганда нашай мовы і культуры — гэта не выключна барацьба з асіміляцыяй, наладжванне нейкіх грамадскіх акцыяў ці плач аб былой велічы ды цяперашнім заняпадзе. Наадварот, мы мусім дэманстраваць не сваю слабасць, а сваю волю, свае магчымасці. Мы мусім паказаць і сабе, і свету, што беларусы — людзі не толькі ў лапцях, а і ў смокінгах, якія жывуць тым, чым жыве ўвесь свет. Менавіта таму я паралельна з асноўнай сваёй прафесійнай і грамадскай дзейнасцю займаюся тым, што шукаю кантактаў з уплывовымі людзьмі і арганізацыямі, каб мець іхнюю падтрымку нашай справе. Так, з фірмаю "Bertelsmann" пачынаюцца перамовы з тым, каб з яе дапамогай наладзіць тут, у Беларусі, вытворчасць кампакт-дыскаў, аўдыё- і відэакасет як з нашым фальклорам, так і з запісамі выканаўцаў класічнай музыкі.

Бо я як музыказнаўца і сацыёлаг ведаю: творчасць таго ж "Палаца" — спалучэнне матываў фолк- і поп-музыкі — можа выклікаць цікаўнасць замежных слухачоў. Цікавым для замежжа будзе і наш аўтэнтычны фальклор, бо этнічная музыка як экзотыка набывае ў свеце ўсё большую папулярнасць. І гэты спіс можна працягнуць.

— "Тэлесябрына" — суполка ТБМ. Але, слухаючы Вас, маеш уражанне, што ўсё, зробленае ёй, было хутчэй плёнам прыватнай ініцыятывы, чым выкананнем нейкіх праграмаў, распрацаваных ці фінансаваных Таварыствам...

— Тое, што мы рабілі і робім, — праца прафесіяналаў і адначасова людзей, не абыякавых да беларушчыны. Таварыства дае нам хутчэй маральную падтрымку: мы, яго сябры, ведаем, што ёсць людзі, якім патрэбна тое, што мы робім. Таму сувязь "Тэлесябрыны" з ТБМ хутчэй ёсць сувязь людзей, духоўна блізкіх. Што тычыцца нейкіх праграмаў ці ўдзелу ў працы ТБМ, дык ужо больш за год я не маю ніякіх звестак з сядзібы арганізацыі, нас не запрашаюць да ўдзелу ў яе справах. Намі не цікавяцца, і нават на маю просьбу перарэгістраваць суполку я не атрымаў адказу. Але гэта не замінае нам рабіць сваю справу далей, бо яна прызначаная не выключна сябрам Таварыства, а ўсім, хто называе сябе беларусамі.

Распытваў У. ПАНАДА

Крымінал-дайджэст

Стрэл у акно кватэры рэдактара

Галоўны рэдактар газеты "Свабода" — фігура ў грамадскім жыцці нашай краіны прыкметная. Адны яго ненавідзяць і лічаць ажно падбухторшчыкам нейкай "дэстабілізацыі", другія паважаюць за прынцыповасць і цвёрдасць у адстойванні права чалавека на свабоду выказвання поглядаў і паўнату інфармацыі. Таму злавесны стрэл у акно кватэры Ігара Герменчука стаў не толькі аб'ектам увагі Менскага РАУС, але і многіх людзей па ўсёй Беларусі і нават за яе межамі.

Куля прабіла дзве шыбіны і прайшла акурат праз тое месца ў кватэры Герменчукоў, дзе журналіст звычайна садзіцца на кухні па вечарах, каб працаваць над рукапісамі, не перашкаджаючы адпачынку сям'і. Следчыя спрабуюць цяпер вызначыць, хто паслаў злавесную кулю. Сам Ігар Герменчук лічыць, што гэта чарговая спроба яго запалохання як галоўнага рэдактара газеты.

Таксама запалохванне?

Дэпутат Вярхоўнага Савета 13-га склікання і актыўны грамадскі дзеяч Анатоль Лябедзька таксама лічыць, што актам запалохвання з'яўляецца напад на яго і жорсткае збіццё двума бамбізамі вечарам у пад'ездзе дома, дзе ён жыве. Па словах А.Лябедзькі, аддзел унутраных спраў Фрунзенскага раёна г.Менска ўзбудзіў справу па факце нападу і збіцця.

Ці адчыняць дзверы невядомым?

Практычна ці не ў кожным нашым мястэчку і горадзе апошнім часам здараліся выпадкі, калі нехта званіў у дзверы, яму адразу адчынялі, а ў выніку ў кватэру ўрываліся бандыты. Пра гэта не аднойчы пісалася ў газетах, але падобныя здарэнні адбываюцца зноў. Толькі ў пачатку гэтага года ў сталіцы міліцыя разбірае ўжо некалькі выпадкаў нападу на кватэры пасля званка. У Партызанскі РАУС звярнуўся работнік адной камерцыйнай фірмы, які легкадумна адчыніў дзверы візіцёрам, якія, пагражаючы гаспадару нажом і гранатай, забралі ў яго некалькі мільёнаў рублёў і кампакт-касеты.

У Цэнтральнае раённае аддзяленне міліцыі сталіцы з той жа бядой звярнуўся жыхар г.Томска, які знаходзіцца ў Менску па камерцыйных справах і па дамове здымаў кватэру. Яму таксама пазванілі ў дзверы, ён адчыніў і ўбачыў накіраваны на яго пісталет. У выніку застаўся жывы, але без грошай.

Вельмі часта пасля званка дзверы адчыняюць даверлівыя дзеці. У такім разе аграбленні адбываюцца самага разнастайнага кшталту, і добра яшчэ, калі самі дзеці не падвяргаюцца нападу.

Ці не сам Бог дапамагаў

Шляхам пагроз чацвёра рэкеціраў са Слоніма прымусілі святара царквы вёскі Верхне-Чэрніхава Баранавіцкага раёна напісаць ім даўгавыя распіскі на 2200 амерыканскіх долараў. Потым, калі яны з'явіліся "выбіваць доўг", то былі непрыемна здзіўленыя наступным "знаёмствам" з супрацоўнікамі Камітэта дзяржбяспекі і міліцыі. Рэкеціры затрыманыя і заключаныя пад ахову. Баранавіцкім гарадскім аддзелам міліцыі ўзбуджаная крымінальная справа па прызнаках артыкула 93 КК РБ, праводзіцца следства, паведамілі з Цэнтра інфармацыі і грамадскіх сувязяў КДБ Беларусі.

Падрыхтаваў У. ВЕРАБЕЙЧАНКА.

Увосень мінулага года Беларусь наведаў выкладчык Тэхаскага універсітэта Курт Вулхайзер. Ён — аўтар дзвюх грунтоўных прац па беларусістыцы: "Сацыялінгвістычнае вывучэнне моўных кантактаў і двухмоўя ў былым Савецкім Саюзе: Беларусь" і "Дыялекты польска-беларускай кантактнай зоны і тыпалогія моўнага пераносу". Першая з іх уяўляе сабой падрабязны агляд сацыялінгвістычных прац беларускіх навукоўцаў — каштоўны тым больш, што гісторыя беларускай сацыялінгвістыкі вельмі мала даследаваная. У другой працы вывучаюцца кантактныя інавацыі ў сумежных польскіх і беларускіх дыялектах з пункту гледжання тыпалогіі моўнага пераносу пры моўных кантактах.

З Куртам Вулхайзерам сустрэўся і паразмаўляў ***Сяргей Запрудскі.***

Курт Вулхайзер:

"АДСУТНАСЦЬ ПАЛІТЫКІ — ГЭТА ЎЖО ПАЛІТЫКА"

— Каторы раз ты ўжо ў Беларусі? Якія мэты цяперашняга прыезду?

— Гэта мой трэці прыезд у Беларусь. Я прыехаў, каб займацца новым даследаваннем. Мяне цікавіць эвалюцыя беларускіх гаворак заходняй Гарадзеншчыны і ўсходняй Беласточчыны ў сацыялінгвістычным аспекце. Гэтыя гаворкі цікавяць мяне таму, што разам з дыялектамі на польскім баку мяжы яны належаць да адной групы гаворак. Можна сказаць, што гэта — своеасаблівая сацыялінгвістычная лабараторыя. На працягу ўсёй сваёй гісторыі яны заўсёды знаходзіліся ў рамках адной дзяржавы. Спачатку гэта было Вялікае Княства Літоўскае, потым — Рэч Паспалітая, затым — Расійская імперыя. Увесь гэты час яны былі ў даволі цесных кантактах паміж сабой, але пасля Другой сусветнай вайны там правялі мяжу, і з гэтага часу яны развіваюцца, можна сказаць, самастойна. Таму вельмі цікава паглядзець, што адбылося за гэты час, якія архаічныя рысы захоўваюцца, якія страчаныя, у якой ступені на гэтыя гаворкі ўплываюць расійская мова на беларускім баку мяжы і польская на польскім баку. Вядома, ёсць таксама і ўплыў беларускай літаратурнай мовы, прынамсі, ён адчуваецца сярод мясцовай інтэлігенцыі.

Я ўжо распачаў гэтае даследаванне на Гарадзеншчыне. Правёўшы цэлы месяц у Гародні, з дапамогай супрацоўнікаў кафедры беларускага і агульнага мовазнаўства Гарадзенскага універсітэта я зрабіў некалькі экспедыцый у розныя вёскі ля беларуска-польскай мяжы.

— Якое ўражанне засталося ад сустрэч з нашымі мовазнаўцамі? Які настрой пануе сярод лінгвістаў — што ўбачылася староннім паглядам?

— Я не сказаў бы, што адчуваецца ўсеагульны адчай, але ў некаторых людзей гэта ёсць. Сапраўды, цяпер, здаецца, у дзяржаве няма ніякай моўнай палітыкі. Такі працэс можна называць самацёкам, але на самой справе гэта ідзе на карысць расійскай мове. Цяпер нічога не робіцца, каб абараніць слабейшую мову, а адсутнасць палітыкі — гэта ўжо пэўная палітыка.

— Што яшчэ кінулася ў вочы гэтым разам?

— Мне здаецца, што цяпер на вуліцы сярод моладзі я чуў беларускую мову часцей, чым, напрыклад, у 1992 годзе. Некаторыя людзі кажуць, што цяпер быццам баяцца нават гаварыць па-беларуску. Можа, гэта і ёсць, але я быў прыемна здзіўлены, калі пачуў тут, у Менску, як падлеткі ў метро размаўлялі па-беларуску.

— Курт, калі ласка, некалькі слоў пра апублікаваны табой агляд сацыялінгвістычных даследаванняў у Беларусі.

— У гэтай працы я разглядаў развіццё сацыялінгвістычных даследаванняў на Беларусі ў рамках агульнасавецкіх працэсаў, бо гаварыць толькі пра сітуацыю ў Беларусі ў колішніх умовах няма сэнсу. Вядома, тут была свая спецыфіка, і, канечне, гэта адлюстроўвалася ў розных даследаваннях. Мяне больш за ўсё ўразіла тое, што ў вас амаль не вывучалася пытанне суб'ектыўнага стаўлення да розных моў. Між тым у заходняй сацыялінгвістыцы гэта плынь вельмі развітая...

— Але ж кнігу Бембеля ты ацаніў даволі высока — якраз за тое, што ён працаваў менавіта ў гэтым напрамку.

— Сапраўды, гэта адзінае даследаванне падобнага тыпу. З пункту гледжання методыкі ў ёй ёсць некаторыя недахопы, часам складваецца ўражанне, што ён проста падыходзіў да выпадковых людзей на вуліцы з канкрэтнымі пытаннямі. Пры сапраўдным сацыялагічным даследаванні так не робіцца. Але калі паўтарыць ягонае даследаванне пры навуковым адборы інфармантаў, то гэта будзе вельмі цікава. Спадзяюся, што нехта з вашых сацыялінгвістаў возьмецца за гэтую справу. А калі не — то, можа, мне прыйдзецца...

Папраўдзе, я ўжо раблю нешта падобнае ў сувязі з маім даследаваннем. Падрыхтаваны наступны сацыялінгвістычны тэст. Два чалавекі, мужчына і жанчына, запісваюць нейкі тэкст на стужку на чатырох мовах. У дадзеным выпадку я ўзяў урывак з "Каласоў пад сярпом тваім". Запіс праводзіцца на беларускай літаратурнай мове, на польскай, на расійскай і на "трасянцы". Даволі цяжка было зрабіць пераклад Караткевіча на "трасянку", але нешта атрымалася. Удзельнікі даследавання слухаюць гэтыя тэксты. Ім кажуць, што гэта розныя галасы, яны не ведаюць, што гэта чытаюць адны і тыя ж людзі. Удзельнікі эксперымента павінны запісаць у анкеце, як яны ўспрымаюць людзей, галасы якіх яны чуюць. Тут галоўная мэта — атрымаць суб'ектыўную ацэнку розных моў. Асаблівасці голасу тут на ацэнку не ўплываюць (бо гучыць адзін і той жа голас), ніяк не ўплывае на ацэнку і змест (бо ён таксама ва ўсіх выпадках той жа самы), так што для ацэнкі тут застаецца канкрэтная мова. Такія тэсты рабіліся ў многіх шматмоўных краінах, і лічыцца, што апісаная методыка дазваляе атрымаць даволі дакладныя звесткі пра тое, як людзі папраўдзе ставяцца да той або іншай мовы. Бо калі проста запытаць у чалавека, як ён, напрыклад, ставіцца да беларускай мовы, магчыма, ён будзе адказваць не зусім шчыра.

Удзельнікам тэста прапануецца адказаць на пытанні накшталт: "Як Вы лічыце, той чалавек, якога Вы слухалі, адукаваны? Ці ён шчыры? Ці мае ён прэстыжную работу? Ці ён працавіты?" Тут я дадаў некаторыя характарыстыкі, якія беларусы прыпісваюць сабе самі: "Ці лічыце Вы гэтага чалавека талерантным? Ці лічыце Вы яго памяркоўным?" Гэты тэст праводзіцца таксама у горадзе Гародні, а затым будзе паўтораны на польскім баку мяжы — у вёсках і ў Беластоку.

— Якія перспектывы развіцця беларусістыкі ва універсітэце, у якім ты працуеш?

— Я ўжо два гады выкладаю ў штаце Тэхас, у горадзе Остын. Наш універсітэт вельмі вялікі, у ім вучыцца каля 50 тысяч студэнтаў. На кафедры славянскіх моваў выкладаецца расійская, чэшская, польская і сербахарвацкая мовы. Я выкладаю расійскую мову, гісторыю ўсходнеславянскіх моваў, уводзіны ў славянскую сацыялінгвістыку. Цяпер мне прапанавалі з наступнага навучальнага года выкладаць уводзіны ў беларусістыку. Так што, акрамя майго даследавання, цяпер я тут таксама збіраў матэрыялы для гэтага курса. Курс разлічаны на пачаткоўцаў, якія не ведаюць ні расійскай, ні беларускай мовы, таму мне патрэбныя матэрыялы на ангельскай мове. Знайсці іх даволі цяжка, але сёетое ў мяне ўжо ёсць. Напрыклад, пераклады беларускай паэзіі Веры Рыч. Таксама мне падарылі пераклад на ангельскую мову "Дзікага палявання караля Стаха"...

— Поспехаў табе, Курт, у развіцці беларусістыкі ў ЗША, і дзякуй за размову.

У суседзяў

Цяпер шмат якія палітыкі ў Расіі, падыгрываючы настроям значнай часткі насельніцтва, якой здаецца, што калі зноў адновіцца імперыя, ім стане лягчэй жыць — будзе рэгулярна выплачвацца зарплата, навалам рабочых месцаў. Гэта ўсё былі б суседскія праблемы, каб у імперскія абдымкі пад тым ці іншым выглядам не меркавалася цесна заключыць Беларусь. Каб прасцей было кіраваць нашым краем, яго плануецца "воссоединить" на гэты раз не цэласным нацыянальна адметным рэгіёнам хаця б з дэкаратыўнымі прыкметамі слабенькай аўтаномнасці, а адразу падзяліўшы на асобныя вобласці з губернатарамі, якія будуць падпарадкавацца расійскаму цэнтру. Гэтая ідэя развіваецца не толькі жырыноўцамі, але і міністр па справах нацыянальнасцяў Аман Тулееў не аднойчы выказваўся за яе таксама. Шмат чутак нарабіў закрыты даклад міністра замежных справаў Расіі Я. Прымакова Дзяржаўнай думе, дзе таксама, кажуць, Беларусь разглядалася часткай будучай новай імперыі са спецыфічнымі функцыямі тэрыторыі перадавога базіравання ядзерных ударных сілаў Расіі, нешта накшталт пашыранай Брэсцкай крэпасці атамнага веку. Кім пры гэтым мяркуецца зрабіць беларускае насельніцтва, зразумела, без дадатковых тлумачэнняў.

У той жа час у самой Расіі ёсць аналітыкі, якія цвяроза ацэньваюць яе стан і прапануюць выйсце з яго, зусім процілеглае ад новаімперскіх мрояў. Адзін з такіх артыкулаў, надрукаваных у салíднай "Общей газете" (№46, 96), мы вырашылі згадаць для чытачоў "НС".

Чаму цар прадаў Аляску?

У 1867 годзе расійскі цар прадаў амерыканцам Аляску за 7,2 мільёна доляраў. За гэта яго дагэтуль праклінаюць не толькі партыйныя і гаспадарчыя наменклатуршчыкі, але і бедныя бабулькі з постсавецкіх вёсак. І ніхто з іх не жадае нават падумаць аб тым, чаму ж цар наважыўся на такі, можна сказаць антыпатрыятычны крок. Наўрад ці ён менш клапаціўся аб цэласнасці Расіі, чым цяперашнія камуна-патрыёты. Верагодна, цар на ўласнай скуры адчуў цяжкасць кіравання велізарнай імперыяй і меў перасцярогу: утрымліваючы вечна мерзлую Аляску, ён страціць больш урадлівыя расійскія землі. Дарэчы, сённяшнія прыхільнікі непадзельнай Расіі, захапіўшыся доказамі непадзельнасці дробненькай выспачкі Шыкатан, ледзьве не страцілі Прыморскі край краіны, штучна стварыўшы там падаткава-энергетычны крызіс.

Толькі праз сто з нечым гадоў навукоўцы з РАН вывелі закон аб энергетычнай неэфектыўнасці вялікай дзяржавы, плошча якой складае каля 500000 кв.км. Гэты закон, бадай, дазваляе цалкам рэабілітаваць мудрага расійскага цара, праклятага няўдзячным расійскім народам. Менавіта груваcткасць з'яўляецца асноўнай прычынаю беднасці Расіі і пры царызме, і пры камунізме — ільвіную долю паглыналі і паглынаюць ненажэрныя дзяржаўныя чыноўнікі, а таксама сілавыя структуры, створаныя дзеля застрашэння свайго насельніцтва і захопу чужых земляў. Успомніце прыпавесць пра чарапаху з двайным панцырам. З такой абаронай яе не мог з'есці нават цар звяроў, але яна ўсё ж загінула — ад уласнага цяжару. Хрушчоўская адліга правалілася пераважна з-за спробы скарачэння апарату чынавенства і арміі, ды і гарбачоўскі "працэс" не пайшоў з той жа прычыны. Сілавікі і чынавенства Расіі — двугаловы змей, у якога вырастае новая галава на месцы адсечанай. Таму пазбавіцца ад яго магчыма толькі адсекшы ўсе галовы.

Калі Расія будзе біцца да апошняй кроплі крыві за кожны кавалак імперыі і знішчаць нацыянальныя меншасці, што не жадаюць жыць з ёю пад адным дахам, дык яна абавязкова загіне ад сквапнасці. Мудрацы з Дзяржлумы, якія нацкавалі Ельцына пачаць вайну з Чачнёю, давялі яго да інфаркта, а краіну — да жабрацтва, да дыстрафіі. Цяпер яны пад лозунгам "Севастопаль — гонар расійскіх маракоў" правакуюць вайну з Украінай. Але як Украіну голымі рукамі не ўзяць, дык дзяржаўнікі дазваляюць сабе нават бразгаць ядзернай зброяй.

У сённяшняй Расіі ёсць адзіны шанс выжыць. Дзеля таго не толькі Крамлю, але і ўсім расіянам трэба выракчыся шматвяковай генетычнай імперскай ганарлівасці, а велічэзную тэрыторыю краіны дзеля выратавання Расіі падзяліць на рэгіёны на ўзор ЗША. Пры тым Крамлю зноў жа дзеля выратавання Расіі неабходна адмовіцца ад рабаўніцкай падаткавай палітыкі, што служыць пераважна захаванню сілавых структураў і дзяржаўных чыноўнікаў. Так, армію магчыма скараціць да разумных памераў цалкам безбалесна, калі Расія ўвойдзе ў склад НАТО. Уваходзячы ў НАТО, Расія вызваліцца ад цяжару, прывязанага да яе ног, і ўсплыве з глыбіні нават без кесоннай хваробы. НАТО — адзіны ратунак для Расіі. А ўжо самастойныя, давedзеныя да ўзроўню штатаў рэгіёны Расіі лёгка дадуць рады лішнім чыноўнікам, бо выдаткі і прыбыткі гадавога бюджэту не дазволяць марнаваць грошы на дзяржаўных лайдакоў, штаты якіх былі раздзьмутыя пры савецкай уладзе дзеля прыхавання рэальнага беспрацоўя ў СССР.

Лукман ЗАКІРАЎ.

Казань.

Чыталі? Чыталі?

Скарбы антычнай літаратуры – дзецям



Летась выдавецтва "Юнацтва" ў дапамогу школам працягвала выпускаць кнігі серыі "Школьная бібліятэка". Сярод іх напрыканцы года пабачыла свет кніжка пад назовам "Легенды і міфы Старажытнай Грэцыі", адрасаваная дзецям малодшага і сярэдняга школьнага ўзросту. (Укладанне і пераклад-пераказ У. Аніскoвіча. Густоўнае мастацкае афармленне выканала Л. Мележ).

Пагартаўшы кніжку, заўважаеш, што яна ў параўнанні з выданнем "Героі Элады". З міфаў Старажытнай Грэцыі", якое выпусціла "Юнацтва" ў 1984 г., значна дапоўненае і перапрацаванае. Тэксты даюцца ў лагічнай паслядоўнасці. Пасля першых раздзелаў, у якіх адбываецца знаёмства чытача з багамі і героямі Старажытнай Грэцыі, ідуць усе асноўныя цыклы старажытнай міфалогіі — "Арганаўты", куды арганічна ўманціраваныя "Подзвігі Геракла", "Траянская вайна" і "Адысея".

Мова і стыль выкладу простыя і даступныя дзецям. Тлумачэнні і заўвагі ў канцы кнігі палегчаць школьнікам засваенне старажытных геаграфічных назваў, уласных імёнаў, дапамогуць увайсці ў міфалагічны свет і зразумець матывы паводзінаў персанажаў.

У невялікім уступе "Замест прадмовы" перакладчык піша: "Старажытнагрэчаская міфалогія — вялікая культурная спадчына, якая належыць усяму чалавецтву, і ў першую чаргу — еўрапейцам. Наша Рэспубліка Беларусь ляжыць у цэнтры Еўропы. Мы — еўрапейцы, і павінны засвоіць гэтую спадчыну. Знаёмства з ёй неабходна кожнаму культурнаму чалавеку".

Безумоўна, выданне "Легендаў і міфаў Старажытнай Грэцыі" будзе з цікавасцю ўспрынятае чытачом, а сама кніга стане папулярнай сярод школьнікаў і выкладчыкаў роднай літаратуры. Думаецца, кніжка можа паспяхова выкарыстоўвацца для пазакласнага чытання прыблізна ў 5-6-м класах, асабліва ў часе вывучэння гісторыі Старажытнай Грэцыі. Гісторыя і літаратура моцна звязаныя. Гісторык павінен ведаць літаратуру, а літаратар — гісторыю. "Легенды і міфы Старажытнай Грэцыі" займаюць у ёй важнае месца, гэтаксама як у літаратуры выкарыстоўваюцца вобразы антычнай міфалогіі.

Шкада, што кнігі серыі "ШБ" Міністэрства адукацыі размяркоўвае па школах і бібліятэках, не дапускаючы іх у гандлёвую сетку. А шмат якія кнігалюбы былі б не супраць іх набываць. Дык, можа, варта адпаведным структурам падумаць пра іх.

Генадзь КАЖАМЯКІН.

Уражанні

ЗБЕРАЖОМ НАШУ СПАДЧЫНУ!

Кожны раз з хваляваннем слухаю чароўную мелодыю Ігара Лучанка на верш Янкі Купалы "Спадчына".

"Ад прадзедаў спакон вякоў
Мне засталася спадчына.
Паміж сваіх і чужакоў
Яна мне ласкай матчынай".

Для ўсіх шчырых беларусаў кожная дэталь у вершы мілая і дарагая, бо выклікае асацыяцыі з дзяцінствам ды і сталым узростам чалавека. Гэта "вясеннія прагаліны, і лесу шэлест верасны, і ў полі дуб апалены". Будзяць успаміны аб Бацькаўшчыне "На ліпе бусел клёкатам", "і крык варонiных грамод"... Але ў сувязі з апошнімі палітычнымі падзеямі ўзнікае трывога за лёс і будучыню Беларусі, бо гэта прае тут пісаў паэт:

"Завецца ж спадчына мая
Ўсяго Старонкай Роднаю".

Усім нам трэба ўсвядоміць, што найвялікшы народны скарб — наша спадчына апынулася ў руках нібы чужакоў, далёкіх ад нацыянальнай ідэі адраджэння, мовы і культуры Беларусі. Чаму так сталася? Няма сумневу — не на карысць беларушчыне працуюць у вышэйшых структурах улады малавядомыя і зусім невядомыя людзі, а то і прыезджыя, чужыя. Дарэчы, пісьменнік Г. Далідовіч пацвярджае ўспаміны іншых, што Пётр Машэраў — тагачасны сакратар ЦК КПБ, сапраўды плакаў на пахаванні І. Мележа: "Хто ведае, можа і ў яго недзе ў глыбіні душы была кропля нацыянальнага пачуцця, дык ён разумеў, каго і што траціць Беларусь" ("Маладосць", № 2, 1996 г.).

Наўрад ці ёсць у многіх нашых вышэйшых кіраўнікоў такая нацыянальная кропля, аб чым сведчыць іхняя дзейнасць. Гэта непрыхільныя адносіны да беларускай мовы — не ўжываюць яе; варожыя да гістарычнай сімволікі — замянілі амаль былой савецкай; выціснулі актыўных патрыётаў-беларусаў з прававога поля за рамкі законнасці і прымусілі іх стаць апазіцыяй. А гэта лепшыя людзі нашага часу, знакамітыя творчыя работнікі, грамадскія і палітычныя дзеячы, у якіх ярка выражаная любоў да ўсяго нацыянальнага: мовы, гісторыі, культуры, традыцыяў, незалежнасці, дзяржаўнасці Беларусі. Таму яны маюць значную падтрымку ў той частцы грамадства, якая называецца беларусамі. Вось чаму пытанне нацыянальнай спадчыны сёння моцна трывожыць многіх з нас: ці надзейным кіруючым асобам народ яе даверыў праз рэферэндум і новую Канстытуцыю. Калі прыгадаць заяву А. Р. Лукашэнкі ў расійскай Думе аб гатоўнасці аб'яднання Беларусі з Расіяй на любых умовах, то словы трывогі Я. Купалы за будучыню нашай Радзімы будуць вельмі актуальнымі:

"І ў белы дзень і чорну ноч
Я ўсцяж раблю агледзіны,
Ці гэты скарб не збрыў дзе проч,
Ці трутнем ён не з'едзены".

Вось такое можа здарыцца пры нас.

Міхаіл ПУЗІНОЎСКІ,
ветэран педагагічнай працы.
г. Ашмяны.

Веруем

Да 2000-годдзя хрысціянства

Асветнікі

1. Ад берагоў Панційскіх

"Святло навукі Хрыстовай дасталося ў Беларусь праз паўдзённых славян у IX — X стагоддзях. Першымі апосталамі агульнаславянскімі зьяўляюцца святыя Кірыл і Мятод".
Кс. Адам Станкевіч.

Праз нашую краіну здавён былі пракладзеныя гандлёвыя шляхі, пра што сведчаць кнігі арабскіх купцоў і падарожнікаў ды шматлікія знаходкі арабскіх, грэцкіх, рымскіх манетаў. І прапаведнікі Хрыстовага слова, пэўна ж, не абмінулі спрадвечнага, выпрабаванага гасцінца — плыні Барысфенавай-Дняпровай і Рубонавай-Дзвінскай, — які цяпер называюць "шляхам з варагаў у грэкі". Апроч Дняпроўска-Дзвінскага кірунку, было вядомае і адгалінаванне: па Прыпяці, Шчары, Нёмане. Гасцей на нашых абшарах было шмат. А скандынаўскія народы і плямёны, што жылі ў Прычарнамор'і, не кажучы ўжо пра грэкаў і рымлянаў, былі знаёмыя з Хрыстовай навукай. Дык можна меркаваць, што хрысціянскія місіянеры наведалі землі радзімічаў, дрыгавічоў і крывічоў задоўга да вядомага Хрышчэння Русі.

Першых хрысціянаў, якія жылі ў Рымскай імперыі, жорстка каралі за іх веру: палілі, забівалі на арэнах цыркаў, мучылі непасільнай працай на катарзе. На каменяломні паблізу Херсанеса (цяпер Севастопаль) быў высланы чацвёрты (па ліку) рымскі папа святы Клемент. У жорсткіх умовах катаргі ён апекаваўся нямоглымі ды падтрымліваў дух сваіх хрысціянскіх братоў, якіх там пакутавала каля дзвюх тысячаў. Нескаронага святога Клемента імператар Траян загадаў утапіць у моры. Гэта адбылося, як мяркуюць, у 97 годзе пасля нараджэння Хрыста. (Шмат стагоддзяў пазней і святому Марціну замянілі смяротнае пакаранне высланнем у Херсанес, дзе ён і памёр у 656 годзе).

І ў гарадах-калоніях, што былі заснаваныя грэкамі, пасяляліся хрысціяне. Прыкладам, у горадзе Тана, які знаходзіўся ля вусця Дона, ужо з палавіны IV стагоддзя меліся мітрапаліт і епіскапы. Былі святары і ў іншых крымскіх гарадах. Ужо ў 325 годзе на Нікейскім саборы ўдзельнічаў адзін Баспорскі (цяпер Керч) епіскап. Іншы епіскап гэтай жа епархіі загінуў у 358 годзе ў Нікамедыі пад руінамі бажніцы, разбуранай землятрусам. На Канстанцінопальскім саборы 360 года прысутнічаў гоцкі епіскап Ульфіла, а ў 381 годзе — Херсанескі епіскап.

З'яўленне першых хрысціянаў на Крыме даследнікі звязваюць і з асяленнем там готаў, якія прыйшлі туды (дарэчы, праз нашыя землі) з паўднёвай Скандынавіі, дзе, як вядома, ёсць востраў Готланд. З гоцкімі набегамі на Бізантыю ў III стагоддзі звязваў пачаткі хрысціянства на Крыме славуты французскі рэлігійны гісторык Л. Дзюшэн. З паходаў у Малую Азію готы прыводзілі палонных, сярод якіх было шмат хрысціянаў. Яны і пачалі распаўсюджваць Хрыстовую навуку на чужбіне. У ліку палонных былі і святары, якія ўтварылі першыя суполкі, а таксама і першыя іерархічныя ўстановы.

З сям'і палонных кападакійцаў паходзіў і згаданы гоцкі епіскап Ульфіла. Як адукаваны чалавек, ён з пасольствам гоцкага караля трапіў у Канстанцінопаль. Там яго заўважылі прыдворныя епіскапы бізантыйскага імператара і высвяцілі яго на епіскапа над готамі. Дома Ульфіла шчыра ўзяўся далучаць гоцкі народ да рымскай і хрысціянскай цывілізацыі. Ён склаў алфавіт, які паспяхова замяніў старое рунічнае пісьмо і пераклаў на гоцкую мову бальшыню кніг Святога Пісання. Былі ў епіскапа Ульфілы і шчырыя памочнікі.

Л. Дзюшэн паведамляе, што ў Скіфію (а гэта Ніжняе Прыдняпроўе) бізантыйскім імператарам Канстанцінам былі высланыя некалькі месапатамскіх аскетаў. Старэйшым над імі быў нейкі Аўдэй (амаль беларускае імя!). Аскеты былі вельмі актыўнымі людзьмі. Іх захапіла ідэя далучыць да сваёй веры мясцовых жыхароў, у тым ліку і готаў. І яны шмат зрабілі дзеля хрысціянізацыі Крыма, пабудавалі некалькі кляштараў.

Цягам часу ўсё больш і больш готаў прымалі хрысціянства. Кароль Германарых нават спалохаўся, бачачы, як ягоныя падначаленыя і нават таварышы пераймаюць рэлігію ворага — рымлянаў. Ён загадаў усім місіянерам, у тым ліку Ульфілу і Аўдэю, сысці з краіны. Аскеты Аўдэя вярнуліся ў сваю Месапатамію, а Ульфіла атрымаў дазвол пасяліцца ў Ніжняй Мізіі, што ля сучаснага Нікапаля. То быў 349 год.

Некаторыя даследнікі звязваюць распаўсюджанне Хрыстовага вучэння на Крыме і ў Паўночным Прычарнамор'і з палітычнымі змаганнямі ды намерамі бізантыйскіх імператараў. Яны, маўляў, свядома кіравалі туды місіянераў, каб праз хрысціянізацыю нейтралізаваць супернікаў, а менавіта крымскіх готаў, хазараў, а пазней таксама і русаў. Нам жа дастаткова знаць, што вучэнне Хрыстова знаходзіла сабе дарогу да народаў, якія жылі на поўнач ад Понта. На зыходзе VIII стагоддзя бізантыйскі патрыярх спрабаваў аб'яднаць царкоўныя іерархіі хазарскіх хрысціянаў пад уладай мітраполіі ў крымскім горадзе Даросе. Але 7 так званых гоцкіх епархіяў, заснаваных ім, распаліся праз некалькі гадоў. Даўжэй праіснавала толькі Баспорская архіепіскапія.

Здзіслаў СІЦЬКА.
(Працяг будзе.)

Цудадзейныя абразы

Васількаўская ікона Божай Маці

Паблізу Беластока, у мястэчку Васількава быў яўлены цудадзейны абраз, які таксама адносіцца да іканаграфічнага тыпу "Змякчэнне злых сэрцаў" ці "Сімяонава прароцтва". На іконе Багародзіца слёзна моліцца, і, паводле прароцтва Сімяона Багапрыімца, Яе святыя грудзі працінае меч пакутаў і скрухі сардэчнай. Цнатлівым поглядам, поўным святой чысціні і высакародства, якія ўвенчаныя каронаю Божай абранасці, "Васількаўская" ікона родніцца з іканаграфічным тыпам "Уміленне", у прыватнасці, "Вострабрамскім Віленскім" цудадзейным абразом Багародзіцы, які ўшаноўваецца вернікамі таксама напярэдадні Ражства Хрыстова і Новага Года.

Паводле старадаўняга падання, з сярэдзіны XV стагоддзя ваколіцы беларускага горада Васількава былі скрозь у лясных гушчарах. У гэтым лесе пакінуты павадыромдзяўчынкаю без ежы і прытулку маліў Царыцу Нябесную аб дапамозе гаротны старац Васіль. Нарэшце, змучаны, ён заснуў. У празрыстым сне ён пабачыў Божую Маці, якая, суцяшаючы яго, сказала: "На тым месцы, дзе ляжыш, рассунь рукою лісце, раскапай пясок — і знойдзеш ваду; ёю прамыеш вочы, веруй — і ацалішся". Усё гэтак і здарылася, нягледзячы на тое, што выспа-холм узвышалася над узроўнем ракі Супраслі. Па словах Божай Маці, вада з'явілася на самай вяршыні выспы. Хворы стаў відушчым і ўбачыў перад сабою дакладную выяву сваёй Ўратавальніцы. І яўленай яму іконе быў зроблены часовы храм-каплічка; паслушнік Васіль вырашае ўсё сваё жыццё прысвяціць Царыцы Нябеснай.

У царкоўных метрыках гэтая драўляная царква называецца "Святая Вада". Адбудаваная яна была за адзін тыдзень у 1719 годзе супрасльскім папяровых спраў майстрам Васілём, які страціў зрок, але ў сне яму было прадказана, што ён атрымае ацаленне пасля малення перад іконаю Божай Маці ў мястэчку Святая Вада. Васіль усё выканаў і ацаліўся, усё гэта здарылася ў дзесятую пятніцу пасля Вялікадня. Ацаляльная крыніца была пакінутая пры царкве. У 1864 годзе, у скрусе за бязвінных ахвяраў паўстання, замест старога драўлянага храма была пабудаваная каменная царква.

Цудадзейная ікона знаходзілася ў алтары і выносілася на сярэдзіну храма ў час малебнаў.

Захаваліся лірніцкія і багамольскія песні, прысвечаныя мясцоваму ўшанаванню гэтай цудадзейнай іконы.

Пухлаўская ікона Божай Маці

Цудадзейны Пухлаўскі абраз належыць да выяў свята Пакрова Божай Маці. Гэты іканаграфічны тып узнік з класічнай сцэны Узнясення, адтуль перайшла і поза-пастава Багародзіцы ў ракурсе з узведзенымі рукамі.

Старажытнейшая з беластоцкіх пухлаўская парафія ўзнікла недзе каля 1500 г.

Пра яе ўзнікненне захавалася прыгожая легенда. Адзін няшчасны чалавек вельмі пакутаваў ад апухлых ног. Жыў ён пад ліпаю у кволай драўлянай пабудове. Аднойчы, звяртаючыся да Госпада з гарачымі малітвамі, ён прыкмеціў на старой ліпе ікону Божай Маці ў ззянні, зусім як жыровіцкія пастушкі ікону "Уміленне" на грушы.

Сваім цудадзейным ацаленнем ад пухліны няшчасны пакутнік даў назву мястэчку. Цудадзейная ікона (на месцы яе з'яўлення была пабудаваная царква ў 1580 г.) стала прадметам ушанавання шматлікіх пілігрымаў, багамольцаў, лірнікаў. Ацэленыя людзі свае ахвяраванні вешалі на сцяне храма каля іконы і запісвалі сведчанні пра час і факты ацаленняў (1646 г., 1710 г., 1732 г., 1812 г., 1830 г., 1855 г. і інш.). Першы пухлаўскі храм існаваў да 1755 г. Аднаўленне царквы пасля пажару было распачатае нараўскім старастам Янам Вільчэўскім у 1756 — 1769 гг. Пасля пажару XVIII ст. новая царква адбудоўваецца ў 1768 г. Чарговыя рэканструкцыі (1852, 1864 гг. і інш.) цалкам змянілі выгляд храма. Цудадзейная ікона мела пазалочаную рызу, багаты раслінны арнамент, пасля рэстаўрацыі цудадзейную ікону змясцілі злева ад іканастаса. З сярэдзіны XIX ст. у Пухлаўскай парафіі існавала шмат і царкоўна-прыхадскіх школаў.

Захаваўся народны верш-услаўленне Пухлаўскай іконы XVI — XVII стст.

Алена ЯСКЕВІЧ.

Гімн да Пухлаўскай іконы Божай Маці

(Народны верш з XVI — XVII стагоддзяў)

Ты, Маці, з'яўлялася ўсюды —
І наш край спазнаў Твае цуды—
У Пухлаўскім сведчаць прыходзе,
Што літасць Твая жыве ў народзе.

У Пухлах з'явілася святая ікона —
Маці Божая стала нам абаронай.
Ты, Прачыстая, нашы Пухлы ўзлюбіла
І цудамі іх па свеце ўхваліла.

Часта Гасподзь караў за грахі людскія —
Заразы, хваробы спасцігалі злыя
І не было нідзе аховы надзейнай —
Як толькі ў малітве ля іконы цудадзейнай.

А хто шчыра да Цябе звяртаўся, —
Той ад бяды ўсялякай збаўляўся,
Бо сваім амафорам Ты нас пакрывала —
Ад пошасці, мору ўсіх ратавала.

Доказ таго — сляды чалавечай падзякі:
У храме падсвечнікі, падвескі і іншыя знакі
За безліч ласкі, што ўсім спасылаеш,
Аздараўленні многія, што ўсіх надзяляеш.

Пакроў Твае Пухлаўскай святыні
Спрадвечна ўслаўлялі і мы славім ныне.
Здаўна падаем у зямным паклоне —
Прыносім пашану Пухлаўскай іконе.

Каб Літасцівая ад бяды ратавала —
Ад марнае смерці ўсіх нас захавала.
І ва ўсе часы будзем благаці:
Ніколі не пакінь нас, Усяслаўная Маці,

Мірам ахіні нашу дзяржаву,
Спашлі ёй удачу, спашлі і славу.
Суймі варожых, прытры ім рогі,
Суціш ганарыстых, скары іх пад ногі.

Брацтву, папячыцельству спашлі збаўленне,
Веры хрысціянскай нястомнае служэнне.
Братамі роднымі няхай усе мы станем
І спрачацца ў рэлігійных справах перастанем.

А ўсім дазволь прыстойна век пражыць
І Цябе чула ў Пухлах прасіць:
Заўсёды пакрывай нас Сваім амафорам
З усімі святымі і ангельскім хорам.

Са старабеларускай на сучасную мову пераказаў Мікола ГАЙДУК.

"Усё ў руках Божых"

Некалькі стагоддзяў побач з беларусамі і прадстаўнікамі іншых нацыяў жывуць у нашай краіне габрэі. Займаліся яны дробным гандлем, рамесніцтвам, але было сярод іх нямала філосафаў, тэолагаў, якія атрымлівалі адукацыю ў вядомых на ўвесь свет школах-ешывах у Вішневе, Любавічах і іншых месцах Беларусі. З асяродку беларускіх габрэяў выйшлі вядомы навуковец тэолаг рабін Гальперын, дзяржаўныя дзеячы Ізраіля Голда Мэір, Шымон Перэс і шмат іншых выбітных асобаў.

У гады камуністычнага панавання тэрор не абышоў бокам і юдэйскія абшчыны. Разам з цэрквамі і касцёламі зачыняліся і сінагогі, а рабінаў, як і святароў іншых канфесій, чакаў шлях у Сібір ці ў Курапаты.

Апошні менскі рабін Мэнахім Мэндль Глускін быў арыштаваны НКУС у 1930 годзе, і лёс яго дагэтуль застаецца невядомым. На працягу некалькіх дзесяцігоддзяў вернікі-юдэі былі вымушаныя дзейнічаць фактычна ў падполлі. Таму многія з іх пры першай жа магчымасці пакідалі БССР і выязджалі на сталае месца жыхарства ў Ізраіль, Амерыку ды іншыя краіны. Асабліва масавая эміграцыя назіралася ў 80-я гады пасля абвяшчэння кампартыяй так званай перабудовы. І ў першую чаргу ехалі найбольш нацыянальна свядомыя людзі, якія пачувалі сябе юдэямі. Наогул габрэі не падзяляюць рэлігійнае і нацыянальнае на два складнікі сваёй свядомасці. Кожны вернік-юдэй з'яўляецца добрым патрыётам сваёй нацыі. Але ўсе выехаць, натуральна, не маглі. І на пачатку 90-х гадоў габрэйскія рэлігійныя абшчыны сутыкнуліся з праблемамі недахопу рабінаў, літаратуры і г.д. У той час многія габрэйскія рэлігійныя арганізацыі свету пачалі накіроўваць у Беларусь сваіх прадстаўнікоў з мэтай ажыўлення рэлігійнага жыцця ў мясцовых абшчынах.


Асабліва моцную дзейнасць распачало сусветнае таварыства хасідаў любавіцкай духоўнай ешывы. Яго прадстаўнік рабін Раф Грузман з Амерыкі разам са сваёй жонкай Тамарай ужо некалькі гадоў працуе ў менскай сінагозе. Наша мэта, гаворыць рабін Грузман, даць людзям і асабліва дзецям тое выхаванне, якое яны не змаглі атрымаць ад сваіх бацькоў у мінулыя гады. Для гэтага ў кожнай сінагозе арганізоўваюцца школы вывучэння традыцый, гісторыі і культуры габрэйскага народа, каб у кожнай з 25 існуючых у Беларусі рэлігійных абшчын людзі маглі жыць паўнавартасным нацыянальным жыццём. На думку спадара Грузмана, ужо ёсць першыя вынікі яго работы.

На святы Пэсах і Ханука ў менскай сінагозе збіралася ад 300 да 400 вернікаў, праўда, у іншых абшчынах ёсць цяжкасці, але рабін спадзяецца, што яны пераадольныя. Зараз ён вядзе перамовы з рознымі юдэйскімі рэлігійнымі таварыствамі і духоўнымі універсітэтамі для таго, каб заахвоціць прыехаць на сталую працу ў Беларусь як мага большую колькасць адукаваных рабінаў.

Розныя габрэйскія рэлігійныя ўстановы дапамагаюць сваім братам у Беларусі духоўнай літаратурай, кашэрнай ежай і іншымі атрыбутамі, неабходнымі для нармальнага функцыянавання абшчынаў. Мінулым летам менскія юдэі пры дапамозе замежных фундатараў наладзілі дзіцячы летнік, у якім адпачывала 150 дзяцей, гаворыць спадарыня Тамара Грузман. За некалькі тыдняў дзеці навучыліся асновам габрэйскага жыцця, што яе вельмі цешыць, бо гэта гаворыць аб тым, што многія людзі пачынаюць шукаць свае нацыянальныя карані. Па словах рабіна Грузмана, у бліжэйшых планах вернікаў менскай абшчыны ёсць задумка пабудаваць вялікі габрэйскі культурны цэнтр з бібліятэкай, рэлігійнай навучальнай установай і іншымі аб'ектамі культурнага жыцця.

А наогул, гаворыць рабін Грузман, усё ў руках Божых, і калі будзе для людзей яго ласка, усе астатнія праблемы вырашацца.

Міша КАЦ.



Не пакідайце ж мовы нашай беларускай, каб не ўмёрлі!

Францішак Багушэвіч.

Ствараем энцыклапедыю "Новай зямлі"

Суседскія пераклады

(Заканчэнне.)

З малымі дзецьмі — малы клопат... Гэта нашая прымаўка згадваецца, калі чытаеш лісты Якуба Коласа да маскоўскіх перакладчыкаў. Пераробкі і рэдагаванне забралі шмат часу, неабходнага для завяршэння іншых твораў, для ажыццяўлення іншых задумаў. "З зямлёю клопат быў вялікі", — чытаеш гэтыя радкі і разумееш, чаму кавалак апошняга раздзела, а менавіта радкі 81 — 101, як згадваецца ў каментары да паэмы, у выданнях 1923, 1927, 1934, 1941, 1946 гадоў адсутнічаюць. Якуб Колас напісаў іх пасля, калі зведаў, што ягонае дзіцятка, паэму "Новая зямля", не вельмі любілі. Адным яно было незразумелым, непатрэбным, як і тыя дзівакі-героі, што праглі свае зямлі. Другім яно было зусім чужое — кулацкае. Трэція наогул ненавідзелі яго, як толькі могуць ненавідзець людзі, зайздросныя таленту іншых. Усё разумеў паэт, таму і дадаў радкі:

Вандруеш, бы ў той Чартавіцы;
Ці дурань сам, ці ўсе дурніцы,
Ці проста кпяць з цябе, дурнога...

Але, як ужо згадвалася, на жыццёвым шляху нашага народнага песняра сустракаліся і сапраўдныя сябры ці проста шчырыя, сумленныя людзі. Адным з такіх быў паэт і перакладчык Пётр Андрэевіч Сямынін. У лістападзе 1949 года, калі ўжо ў Менску выйшла "Новая зямля" ў расійскім перакладзе, Якуб Колас пісаў яму: "Мой мілы і ў трэцяй ступені дарагі мне Пётр Андрэевіч, просты, харошы чалавек! У сувязі з Вашым "катаржным" знаходжаннем на Беларусі, калі Вы самаахвярна працавалі над зводам перакладаў "Новай зямлі", а ў сапраўднасці самі гэтыя пераклады ажыццявілі, справілі, дапоўнілі, тое-сёе адкінулі, я хачу з пачуццём глыбокай да Вас удзячнасці сказаць Вам: "Вялікі Вам дзякуй за Ваша харошае чалавечае сэрца, за Вашу дапамогу мне. Людзі, я гавару пра нашых беларусаў, так-сяк запазнаных з Вамі, — у адзін голас гавораць — цудоўны чалавек, харошы, сціплы, цудоўны перакладчык і паэт Пётр Андрэевіч Сямынін! І гэта сапраўды так.

Не прыміце гэтыя мае словы за пахвальбу: далі-Бог, я так адчуваю і так кажу, таму што гавару ад шчырага сэрца паэта-беларуса".

Дарэчы, супрацоўніцтва Якуба Коласа з Пятром Сямыніным не ад "Новай зямлі" пачыналася. За некалькі гадоў да гэтага (як вынікае з ліста Міхасю Лынькову ад 11 кастрычніка 1947 года) у Маскве рыхтавалі выданне Коласавай паэмы "Рыбакова хата". Пераклад даручылі тром паэтам. Апроч Пятра Сямыніна, перакладчыкам меўся быць і С. Гарадзецкі. Але з ягоным чытаннем новай паэмы Якуба Коласа адбывалася далей тое ж, што і з "Новай зямлёй". Пётр Сямынін жа і тады справіўся лепш за іншых. Неўзабаве пасля заканчэння працы над "Новай зямлёй", калі яна ўжо была ў наборы, у лісце С. Гарадзецкаму наш паэт згадаў: "Сёння атрымаў ліст ад Сямыніна. Між іншым, паведамляе, што "Рыбакова хата" ўжо звярстана і, магчыма, выйдзе сёлета, што пра самую паэму і яе пераклады рэцэнзенты далі водгукі."

У лісце самому П. Сямыніну з санаторыя "Барвіха" Якуб Колас пісаў: "Тут адпачывае С. Я. Маршак. Я падараваў яму "Хату рыбака". Ён мне гаварыў, што Вашыя пераклады самыя лепшыя, што, не заглядваючы ў змест, ён беспамылкова пазнае раздзелы, перакладзеныя Вамі".

Падрыхтоўкай перакладу "Новай зямлі" сяброўства з Пятром Сямыніным не скончылася. Ён прыклаў руку і да з'яўлення на расійскай мове "Сымона-музыкі". Якуб Колас паведамляў, як ідуць справы з выданнем, турбаваўся пра стан здароўя "дарагога Пятра Андрэевіча", цікавіўся і спадзяваўся, што яму дадуць кватэру, дзяліўся планамі.

Здзіслаў СІЦЬКА.

Жывое слова

Арап

З малых гадоў чуў: "Ногі, як у арапа" — гэта значыць, вельмі брудныя, чорныя, закарэлыя. Яшчэ пра такія ногі казалі: "Хоць рэпу сей".

Даўней усе дзеці на вёсках — дый, пэўна, і ў малых гарадах і мястэчках — цэлае лета бегалі босыя, бегалі па лужах, мясілі гразь, то і іхнія ногі скрозь былі закарэлыя, чорныя, як зямля. І, мабыць, больш дакладнага азначэння пра такія ногі і нельга было прыдумаць. Але чаму "як у арапа"? Калі малы быў, думаў, што арап — гэта негр. А калі так, то ўсё зразумела, чаму ногі ў таго ці іншага хлапчука, як у арапа. А калі пачаў у школу хадзіць і пачуў выслоўе: "арап Пятра Вялікага", дык чамусь і зусім задаволіўся. Мне падалося, я знайшоў адказ на сваю цікаўнасць. Але далей-болей: пачаў цікавіцца, ці ёсць слова "арап" у нашых слоўніках. І найперш, у беларускіх. Чаму ў беларускіх? Ды таму, што пачуў найперш гэтае слова ў мове свайго народа. У "Тлумачальным слоўніку беларускай мовы" вычытаў: "Арап — ашуканец, жулік". Гэта было адзінае тлумачэнне слова "арап". Іншых значэнняў слова "арап" у тлумачальным слоўніку не было. Але такое тлумачэнне мяне не задавальняла. Яно не давала ніякага адказу пра выток выслоўя "ногі, як у арапа".

Пры тлумачэнні не было і прыкладу з нашай моўнай практыкі. Гэта азначала, што слова ці мала вядомае ў роднай мове, ці мала ўжыванае. Праўда, слова было праілюстраванае ўстойлівым словазлучэннем "браць на арапа", што азначала "браць ашуканствам, падманам". Але гэтае словазлучэнне і яго тлумачэнне з іншай песні, з іншай оперы. Мне ж хацелася спазнаць, чаму брудныя ногі калісь параўноўвалі з арапавымі. Пэўны адказ на сваё пытанне знайшоў у слоўніку Уладзіміра Даля. Там у першым томе гаворыцца: "Арап — з прыроды, з племя чарнаскурых, чарнацелы чалавек з спякотных краін, ... негр".

Вось гэтае тлумачэнне і дае адказ, чаму нашыя дзяды і прадзеды брудныя, закарэлыя ногі параўноўвалі з арапавымі. Слова "арап" з значэннем чарнаскуры, цёмнай скуры чалавек зафіксаванае і ў слоўніку Ожэгава. Але чаму не зафіксавалі згаданае слова ў гэтым значэнні ў нашым тлумачальным слоўніку? Падалося, — а яно, як пасля высветлілася, так і было, — слова "арап" не патрапіла ў картатэку, яго не "расчыталі". У беларускіх мовазнаўцаў не было пад рукой і прыкладаў з жывой мовы. А я сведчу: на Жлобіншчыне даўней вельмі часта карысталіся азначэннем "ногі, як у арапа".

... Цяпер дзеці мала бегаюць босыя, ім не дазваляюць бегаць па лужах, мясіць гразь. Ногі цяперашніх дзяцей чысцюткa белыя, хіба адно трохі прыпыленыя. То і выслоўе "ногі, як у арапа" рэдка чуваць. А даўней ім вельмі часта карысталіся, бо і жыццё ў дзяцей было іншае.

Паміж іншым, слова "арап" з значэннем чарнаскуры, цёмнай скуры чалавек, негр занатавана ў нашых этымалагічным, гістарычным і новым перакладным руска-беларускім слоўніках, але зноў жа без прыкладаў з жывой мовы ці якіх іншых літаратурных крыніц. Паводле "Этымалагічнага слоўніка беларускай мовы" слова "арап" найбольш верагоднае з цюркскай, дзе вядомае ў значэнні негр. Беларускае пазычана з турэцкай ці крымска-татарскай, праз украінскую, менш верагодна — праз расійскую. У старых беларускіх помніках слова "арап" сустракаецца з канца XVI стагоддзя.

Напісаўшы гэтую нататку, прачытаў яе маме. Яна, выслухаўшы, дадала: "Летам босыя хадзілі даўней не толькі дзеці. Усе хадзілі басяка і багата ў каго ногі былі, як у арапа". Гаварылі і так: "Ходзіць, як арап". Але чаму так казалі, я сказаць табе з гісторыі не магу. Але так казалі — гэта праўда".

Пакуль я абсмоктваў свайго "арапа" з усіх бакоў, так і гэтак, раптам прыгадаў, што гэтым словам аднойчы пакарыстаўся і Францішак Багушэвіч. У ягонай баладзе "Хцівец і скарб на Святога Яна" чытаем:

Калі ж наляцелі калмыкі,
а р а п ы,
Шаблямі махаюць, аж трасуцца храпы...

Уладзімір СОДАЛЬ.

P. S. Летась выйшаў з друку новы аднатомны "Тлумачальны слоўнік беларускай літаратурнай мовы". Ён выправіў хібу ранейшага тлумачальнага слоўніка. У ім ужо зафіксаванае слова "арап" з значэннем "цёмнаскуры чалавек", негр (уст.).

Культура мовы

ДА ЧАГО ВЯДЗЕМ?

Чарговая спроба вынішчэння нашай мовы ўяўляецца мне небяспечнай асабліва з адной прычыны: запанавалі калькі. З свайго досведу знаю, як цяжка часам падабраць адпаведнік звычайнаму навуковаму ці тэхнічнаму тэрміну. А калька — вось яна, падобная на роднае слоўца. *Бягучы год, рабочы дзень, вядучы спецыяліст, вядучая галіна навукі, бягучы радок...* І толькі, калі ўдумацца, жахнешся: моўныя пачвары! А якое выйсце? Што да першага і другога, то беларускія адпаведнікі вядомыя: *сёлетні год* або проста *сёлета; працоўны дзень*. Складаней з "*вядучым*". Гэтаму слову аўтары "Тэрміналагічнага слоўніка па вышэйшай матэматыцы для ВНУ" прапанавалі адпаведнік — *галоўны*. Калі гаворка, скажам, пра спецыяліста, то можна такога супрацоўніка назваць першым спецыялістам. Сэнс захаваны: ён усё робіць першым, пачынае, а за ім ідуць іншыя.

Такім жа чынам падбіраем адпаведнікі вайсковым тэрмінам. Прыкладам, ведущий самолет — першы самалёт (але не "вядучы", хаця б толькі таму, што ён нікога не вядзе). А ў "Русско-белорусском словаре для военных" ужо замацаваная калька: ведущий тральщик — вядучы тральшчык. Сюды ж, дзеля кампаніі, падстаўлена словазлучэнне ведущее колесо — вядучае кола. А яны ж толькі знешне падобныя, а значэнні маюць розныя. Тэхніцызм "ведущий" выкарыстоўваюць, калі трэба назваць частку машыны, прылады, якая перадае рух іншым часткам. "Ведущая ось" — гэта вось, якая перадае цягу, круціць колы, цягне, рухае машыну. Тут, мабыць, можна выбіраць з некалькіх варыянтаў: цягавая вось; вось-цягнік; вось-цягун (у "Беларуска-расійскім слоўніку" М. Байкова і С. Некрашэвіча *цягун* — гэта буксір). І фразеалагізм "ведущее колесо" (яно не перадае руху іншым часткам, а толькі круціцца, бо замацаванае на восі-цягуне) можна, мабыць, замяніць адным словам: цяг; цягун; цягавік (цяга; цягуна; цягавіца). Выбраць адпаведнае ці падказаць лепшае — гэта зробяць спецыялісты: шоферы, тэхнікі, інжынеры.

Шмат клопату будзе і з "бягучым радком". Звычайна ў такіх выпадках прапануюць мяняць кантэкст цалкам: радок, які бяжыць. Але гэты адпаведнік занадта груваскі. Да таго ж, "бягучы радок" — гэта фразеалагізм, які стаў назвай, назоўнікам. І наўрад ці можна яго замяніць нечым падобным: плынны радок; дзейны радок. Такая прапанова супярэчыць вызначэнню нашай мовы, як дасканала распрацаванай. Нашыя прашчуры ўмелі знаходзіць трапнае слоўца. То і нам трэба шукаць.

Што такое радок, які бяжыць? Гэта чарада літараў, словаў, што рухаюцца на экране тэлевізара ці на спецыяльным экране, з якіх складваецца пэўны сказ, тэкст. Дык паспрабуем скамбінаваць так: чарада (ад якой чарод-ка) — чарадок. *Назва перадачы, праграма, інфармацыя падаецца чарадком.* Як гэта гучыць? Мабыць, не горш, чым "бягучым радком"?

Ды як казалі прашчуры, сем разоў адмер, і то не вер. То запытаемся ў мовазнаўцаў.

Пісаў калісьці Язэп Лёсік: "Трэба вытвараць новыя словы, новыя фразеалагічныя ды сінтаксічныя звароты. Да гэтае работы наша інтэлігенцыя выступіла з псіхалогіяй расійскае мовы, з расійскім думаннем, з расійскім, а часам і з польскім спосабам выкладання сваіх думак на пісьме...".

Пятро ПАШКАВЕЦ.

(Заканчэнне будзе.)

Мікалай КРЫЎКО — беларушчына.
Алена ШЧУКА — англійшчына.

Слоўнік сінонімаў

ПРАКЛЯСЦІ (падвергнуць праклёну)*(Ілька): — І яшчэ я думаю, каб мы кінулі сваё валацужнае бруднае жыццё,.. і каб мы ўсе працавалі... Марта: — Калі ты зробіш так, цябе праклянe ўвесь род...* (Каваль). **СКЛЯСЦІ** *Кажуць нашы баркаўчане, што той сват, няначай крыху вядзьмак быў, бо ўсё так і сталася, як ён скляў* (Калюга), **ВЫКЛЯСЦІ** размоўнае *Стары Прусак, якога выкляў Бог і вырякліся людзі, .. Убачыў неяк недарэчны сон* (Валасевіч). — *Незакончанае трыванне:* **Праклінаць, склінаць, выклінаць.**

ПРАКЛЯТЫ (такі, які заслугоўвае праклёну, бо чыніць зло, прыносіць непрыемнасць) — *Эх, Іван, Іван, праклятая вайна паламала ўсё...: — Лёля сціснула яго руку і замаўчала* (Алешка). *Камандзір дадаў: Навошта ж нам вяртацца назад у Дзісну праз гэтыя праклятыя балоты?* (Машара), **ВЫКЛЯТЫ** разм. *І маладых тапографаў узвод Спяшаўся вывучыць Ландшафт Карпатаў Або Мазурскіх выклятых балот* (Аўрамчык). *Ох, Богут, выклятае племя, Навошта гад такі жыве!* (Колас), **АКАЯННЫ** разм., лаянкавае *Ляці ж маё слова, далёка ў свет!.. і гукні ім: "Падохніце вы ўсе, акаянныя абдзіралы, крыўдзіцелі, каты, на радасць простых працоўных людзей!"* (Колас). *Шалелі завеі, Снягі бушавалі, Тут мерзлі шафёры на перавале І вецер і холад клялі акаянны* (Грахоўскі).

ПРАКЛЯТЫ Англ. адпаведнікі: **damned, cursed, accursed**. З двух марфалагічных варыянтаў cursed, accursed апошні належыць да кніжнай лексікі. А прыметнік damned мае шырокі ўжытак як-размоўная (часта лаянкавая) адзінка. (Параўнай бел.акаянны).

ПРАКОС (доўгая града скошанай травы) *Трава лёгка паддавалася і пакорна лажылася ў роўныя пракосы* (Колас), **ПАКОС** *Зноў шпарка захадзілі косы, кладучы пакос за пакосам* (Каваль), **РАД** дыялектнае *Глушачыха і Халімон нібы памаладзелыя, разварушвалі і разварушвалі копы, пераварочвалі рады* (Мележ).

ПРАКТЫЧНЫ (звязаны з рэальнымі патрэбамі, з прымяненнем, выкарыстаннем чаго-н.) *Яго даклад носіць практычны характар. Пытанне аб засваенні раслінай глебавай вуглекіслаты мае вялікае практычнае значэнне* ("Весці Акадэміі навук Беларусі"), **УТЫЛІТАРНЫ** (з назоўнікамі "характар", "прызначэнне", "мэта" і пад.: цалкам практычны) *Замак меў чыста ўтылітарнае прызначэнне і быў месцам, дзе насельніцтва хавалася на перыяд ваеннай небяспекі* ("Помнікі гісторыі і культуры Беларусі"). *Максім Багдановіч ставіць і вырашае праблему ідэйна-мастацкай вартасці паэтычных твораў і іх утылітарнай ролі для грамадства* (Майхровіч). — **Практычнасць, утылітарнасць.**

У гэтым выпадку ў англійшчыне знаходзім таксама два сінонімы, прычым абодва падобныя да беларускіх як семантычна, так і фармальна: **practical і utalitarian.** Абодва словы іншамоўнага паходжання, як і бел. сінонімы, і належаць да так званых інтэрлексем.

ПРАЛЕЗЦІ (з цяжкасцю, з намаганнем прайсці, прабрацца праз вузкую адтуліну, вузкі праход і пад.) *На лесвіцы і на балконе стоўпіліся госці, кожны хацеў пралезці наперад* (Пятроў), **ПРАЦІСНУЦЦА** узмацняльнае *Свірыд устаў, апрануў паліто і праціснуўся праз парадзелы натоўп да дзвярэй* (Дуброўскі), **ПРАПХНУЦЦА** разм., узмацн. *Сюды (на бойку) бягуць з усіх бакоў сябры — спрабуюць угаворваць... Ужо між іх прапхнуўся Жора, Ужо чуваць яго крыклівы І нудны голас...* (Бачыла), **ПРАШЫЦЦА** разм., узмацн. *Ганна прашылася да прылаўка і ўзяла адважаны хлеб* (Гартны), **ПРАТАЧЫЦЦА** разм., узмацн. *Ледзь пратачыўся праз натоўп*, **ПРАПЛІШЧЫЦЦА** разм., узмацн. *Праплішчыцца праз дзірку ў плоце. Пакуль Сомаў закідваў запасны лавок, яго бабёр траха не ўцёк: адцягнуў пярэднімі лапамі дзверцы і пачаў праплішчвацца вонкі* (Масарэнка). — *Незак.:* **Пралазіць, лезці, праціскацца і праціскваццa, ціснуцца, прашывацца, шыцца, праточвацца, тачыцца, праплішчвацца, плішчыцца.** — Параўнайце: 1. П р а б і р а ц ц а.

ПРАЛЕСКА (травяністая расліна сямейства казяльцовых з сінефіялетавымі кветкамі, якія зацвітаюць адразу пасля раставання снегу) *Высыпалі раптам пралескі і адразу завязаліся на цвет* (Пташнікаў), **ПАДСНЕЖНІК** разм. *Мне ўсё мацней карціць пачуць Званочак срэбны ў паднябессі, Прыпільнаваць, калі чуць-чуць Падснежнік выгляне на ўзлессі* (Гілевіч).

ПРАЛЁТ (сезоннае перамяшчэнне птушак) *Іншыя вадаплаваючыя птушкі, як, напрыклад, лебедзі, гусі, крохалі і многія віды качак, у Беларусі паяўляюцца толькі на пралёце вясною і ўвосень* ("Геаграфія БССР"), **ПЕРАЛЁТ** *Яны (арнітолагі) з'ехалі на Амур, бо там пералёт пачаўся ўжо* (Караткевіч).

Праграма тэлебачання

Панядзелак, 24 лютага

Беларускае тэлебачанне

7.30 Ранішні express.
7.45 Тэлеанонс.
7.50, 17.45 Эканамікст.
8.00 Рэзананс.
8.45 Мультфільм.
9.05 Студыя "Акно".
10.10 Конкурс "Дзяўчына месяца".
10.20 Цёмны пакой. Цыганы.
10.55 "Тэатральныя гісторыі". М. ф.
11.45 Тэлевізійны Дом кіно.
12.25 Кампазітары Беларусі. Да 80-годдзя Эдзі Тырманд.
13.00, 15.00, 18.00, 24.00 Навіны.
15.10 Відэакурс французскай мовы.
15.40 Тэлебачанне — школе. Музыка. 6-ы клас.
16.10 Параграф. Рынак працы.
16.40 "На добры лад".
17.10 Госці ў дом. Краіны Поўначы халоднай.
18.10 Тэлеанонс.
18.20 "Рабакоп".
19.10 Беларускі гіт-парад.
19.15 Тэма дня.
19.30 Эканамічная праграма.
19.45 Беларускі дом. "Спадчына".
20.10 Люстэрка.
20.40 Калыханка.
21.00 Панарама.
21.50 "У горадзе С." М. ф.
23.30 Музыка без межаў.

ГРТ

11.00, 14.00,17.00, 22.20 Навіны.
11.25 Лыжы. Чэмпіянат свету.
13.00 КВЗ-асарці.
13.20 "У пошуках страчанага" Сара Леандр.
14.20 "Альберт — пяты мушкецёр".
14.45 Марафон-15.
15.00 Зорны час.
15.40 "Ніко і яго сябры".
16.10 ... Да шаснаццаці і старэй-шым.
16.35 "Вакол свету".
17.15 "Дзяўчына па імені Лёс".
18.10 Час пік.
18.35 Адгадай мелодыю.
19.00 "Мы".
19.45 Добрай ночы, малышы!
20.00 Час.
20.45 "Полтэргейст". М. ф., 6-я ч.
21.40 "Срэбраны шар". Фрэнк Сінатра.
22.30 "Чароўны стралок". М. ф.
0.25 Прэс-экспрэс.

Расія

7.00, 10.00, 16.00, 19.00, 22.00 Весткі.
7.15, 8.25, 9.55 Тавары — поштай.
7.25, 17.40 "Клубнічка".
7.55 "Дарагая рэдакцыя..."
8.35 Ананімныя суразмоўцы.
9.05, 20.10 "Санта-Барбара".
13.25 Тамара Гвердцытэлі і Мішэль Легран у Нью-Йорку.
13.50 Чэмпіянат свету па лыжных відах спорту.
14.30 Бясконцае падарожжа.
15.00 Разам.
15.25 Дамашні доктар.
15.30 Новае "Пятае кола".
16.15 Іваноў, Пятроў, Сідараў і іншыя.
16.55 Там-там навіны.
17.05 Лукамор'е.
17.25 Паглядзі на сябе.
18.10 Двайны партрэт.
18.40 Асабліва важныя персоны.
19.35 Мультфільм.
21.10 "Добры вечар".
22.30 "На кані". Тэлелатарэя.
22.45 Дзяжурная частка.
23.00 "Алё, я вас чую..." Муз. праграма.
23.40 Шоў даўганосікаў.

Санкт-Пецярбург

11.55, 13.55, 15.55, 18.55, 21.55 Інфарм ТБ.
12.10, 19.20 "Гісторыя кахання".
13.00 Тэрмін адказу — сёння.
14.10 Міжнародны агляд.
14.45 "Пажывём-пабачым".
15.10 Авертайм.
15.40, 20.40 Тэлеслужба бяспекі.
16.10 "Дом кіно".
16.50 Дзіцячае ТБ.
17.30 Шастаковіч — знаёмы і незнаёмы.
18.30 Санкт-Пецярбург запрашае Алімпіяду-2004.
18.40 Скарбы Пецярбурга.
19.15 Спорт.
20.10 Датычыцца ўсіх.
21.00 Кубак Англіі па футболе.

НТБ

17.30 Футбольны клуб.
18.00, 21.00, 23.00 Сёння.
18.40 Герой дня.
19.05 "Удушлівая спякота". М. ф.
21.40, 23.00 Часінка.
22.00 "Хуткая дапамога". М. ф.

Аўторак, 25 лютага

Беларускае тэлебачанне

7.30 Ранішні кактэйль.
7.45, 19.10 Беларускі гіт-парад.
7.50, 17.45 Эканамікст.
8.00, 13.00, 15.00, 18.00, 23.45 Навіны.
8.10 Абібок.
8.40 Эканамічная праграма.
9.00 Тэлебачанне — школе. Музыка. 6-ы клас.
9.30 Мультфільмы.
9.45 Тураб'ектыў.
10.05, 18.20 "Рабакоп".
10.55 "Калі ж пойдзе снег?.." Відэафільм.
12.05 Чацвёртае вымярэнне.
12.30 Акалада.
15.10 Усё пра ўсё.
15.35 Тэлебачанне — школе. Гісторыя Беларусі. 8-ы клас.
16.05 Педагагічны экран. Пазакласная работа са школьнікамі.
16.30 Востры вугал.
17.10 Урокі Н. Наважылавай.
19.15 Тэма дня.
19.30 Пазнай сябе. "Вытокі характару". Псіхалагічна-кансультатыўная праграма.
20.00 Трэці тайм.
20.40 Калыханка.
21.00 Панарама.
21.50 "Белы праклён". М. ф.
23.15 Тэлевізійны Дом кіно.

ГРТ

11.00, 14.00, 17.00, 22.20 Навіны.
11.20 Лыжы. Чэмпіянат свету.
12.45 КВЗ-асарці.
13.15 "У пошуках страчанага". А. Валодзін.
14.20 "Таямніцы старога Лондана". Мультсерыял.
14.45 Квар'етэ "Вясёлая кwампанія".
14.55 Мультытролія.
15.10 Чароўны свет, або Сінема.
15.40 "Ніко і яго сябры". М. ф.
16.10 ...Да шаснаццаці і старэйшым.
16.35 "Вакол свету".
17.15 "Дзяўчына па імені Лёс".
18.10 Час пік.
18.35 Адгадай мелодыю.
19.00 "Тэма".
19.45 Добрай ночы, малышы!
20.00 Час.
20.45 "Белыя росы". М. ф.
22.35 "50 x 50".
23.15 Прэс-экспрэс.

Расія

7.00, 10.00, 16.00, 19.00, 22.00 Весткі.
7.15, 8.20, 9.55, 0.15 Тавары — поштай.
7.25, 17.40 "Клубнічка".
7.55 "Дарагая рэдакцыя..."
8.30, 19.35 "Аншлаг" прадстаўляе.
9.05, 20.10 "Санта-Барбара".
13.25 "Сабака на сене". М. ф., 1-я ч.
14.30 Дыялогі пра жывёл.
15.00 Да 60-годдзя акадэміка А. М. Панчанкі.
15.25 Манекен.
15.30 Ваша права.
16.15 Іваноў, Пятроў, Сідараў і іншыя.
16.55 Там-там навіны.
17.05 Лукамор'е.
17.25 Паглядзі на сябе.
18.10 Момант ісціны.
18.40 Асабліва важныя персоны.
21.10 Добры вечар.
22.30 Царская ложа.
23.10 Гукавая дарожка.
0.05 Толькі для дарослых.

Санкт-Пецярбург

11.55, 13.55, 15.55, 18.55, 21.55 Інфарм ТБ.
12.10, 19.20 "Гісторыя кахання".
13.00 Тэрмін адказу — сёння.
14.10 Тата, мама і я — спартыўная сям'я.
14.35 Мультфільм.
14.45, 21.00 "Макшэйн". Серыял.
15.35, 20.45 Тэлеслужба бяспекі.
16.05 І. Стравінскі ў Пецярбургу.
16.45 Дзіцячае ТБ.
17.30 "Жыццё маё — опера".
18.30 Санкт-Пецярбург запрашае Алімпіяду-2004.
18.40 Вялікі фестываль.
19.10 Спорт.
20.15 Храм.
22.00 Падзея.
22.20 Спартыўны агляд.
22.30 Парадоксы гісторыі.
22.55 Хакей. Чэмпіянат РХЛ.

НТБ

17.30 "Вуліца Сезам".
18.00, 21.00, 23.00 Сёння.
18.40 Герой дня.
19.05 "Час ганьбы". М. ф.
20.50 "Няўклюды" С. Альтава.
21.40, 23.20 Часінка.
22.00 "Хуткая дапамога". М. ф.

Серада, 26 лютага

Беларускае тэлебачанне

7.30 Ранішні кактэйль.
7.45, 19.10 Беларускі гіт-парад.
7.50, 17.45 Эканамікст.
8.00, 13.00, 15.00, 18.00, 0.05 Навіны.
8.10 "Дакрануўшыся да мінулага", "Кола". Д. ф.
8.30 Бархатны сезон.
9.00 Тэлебачанне — школе. Гісторыя Беларусі. 8-ы клас.
9.30 Мульціклуб.
10.00 Кампутарны палігон.
10.25 "Іван Насовіч". Д. ф.
10.40 Госці ў дом.
11.10, 18.20 "Рабакоп".
12.00 Відзьма-нявідзьма.
15.10 Мультфільм.
15.25 Відэакурс французскай мовы.
15.55 Канцэртны сезон.
16.30 ШАНС. Інфармацыйна-аналітычная праграма.
17.10 "Міхаіл Савіцкі". Д. ф.
19.15 Тэма дня.
19.30 "Не памажаш — не паедзеш". Масла "Нафтана".
19.45 "Хто гэта?" Тэлегульня.
19.50 Аўта-парк.
20.00, 21.50 Баскетбол. Адборачны турнір чэмпіянату Еўропы.
20.40 Калыханка.
21.00 Панарама.
22.35 "Чаму я?" М. ф.
0.15 Каралеўскае паляванне.

ГРТ

11.00, 14.00, 17.00, 22.35 Навіны.
11.20 "Семнаццаць імгненняў вясны". М. ф., 5-я ч.
12.25 Мультфільм.
12.55 КВЗ-асарці.
13.15 "У пошуках страчанага". Ф. Раняўская.
14.20 "Таямніцы старога Лондана".
14.45 Кактус і К.
14.55 До-мі-соль.
15.10 Кліч джунгляў.
15.40 "Ніко і яго сябры".
16.10 ...Да шаснаццаці і старэйшым.
16.35 "Вакол свету".
17.15 "Дзяўчына па імені Лёс".
18.10 Час пік.
18.35 Адгадай мелодыю.
19.00 "Парыжскія таямніцы Э. Разанава". П'ер Рышар.
19.45 Добрай ночы, малышы!
20.00 Час.
20.45 "На Дзерыбасаўскай добрае надвор'е, або На Брайтан-Біч ідуць дажджы". М. ф.
22.45 Прэс-экспрэс.

Расія

7.00, 10.00, 16.00, 19.00, 22.00 Весткі.
7.15, 8.20, 9.55, 0.20 Тавары — поштай.
7.25, 17.40 "Клубнічка".
7.55 "Дарагая рэдакцыя..."
8.30, 19.35 Хамелеон.
9.05, 20.10 "Санта-Барбара".
13.25 "Сабака на сене". М. ф., 2-я ч.
14.30 Тэлескоп.
15.10 Рэпарцёр.
15.25 Экспавеснік.
15.30 Спосаб жыцця.
16.15 Іваноў, Пятроў, Сідараў і іншыя.
16.55 Там-там навіны.
17.05 Лукамор'е.
17.25 Паглядзі на сябе.
18.10 Чалавек на Зямлі.
18.40 Асабліва важныя персоны.
21.10 Добры вечар.
22.30 Ціхі дом.
23.10 Чэмпіянат свету па лыжных відах спорту.
0.10 Толькі для дарослых.

Санкт-Пецярбург

11.55, 13.55, 15.55, 18.55, 21.55 Інфарм ТБ.
12.10, 19.20 "Гісторыя кахання".
13.00 Тэрмін адказу — сёння.
14.10 Асабістая справа.
14.35 Мультфільм.
14.45, 21.00 "Макшэйн".
15.35, 20.45 Тэлеслужба бяспекі.
16.10 Яшчэ адна Расія.
16.50 "Белая паласа". "Кароль і блазан". Музычны дадатак да "Зебры".
17.30 Тэлефільм.
18.30 Санкт-Пецярбург запрашае Алімпіяду-2004.
18.40 Вялікі фестываль.
19.10 Спорт.
20.10 "Пажывём-пабачым".
21.00 Падзея.
21.20 Спартыўны агляд.
22.30 "Тэлекампакт".

НТБ

18.00, 21.00, 23.00 Сёння.
18.40 Герой дня.
19.05 "Гатэль "Палас". М. ф.
20.45 Група "Парк Горкага".
21.40, 23.20 Часінка.
22.00 "Хуткая дапамога". М. ф.
24.00 Меламанія: "Фрэнк Запа. Гумар у музыцы".

Чацвер, 27 лютага

Беларускае тэлебачанне

16.00 Тэлебачанне — школе. Беларуская літаратура. 11-ы клас.
16.30 "Арсенал".
17.10 Урокі Н. Наважылавай.
17.45 Эканамікст.
18.00, 0.05 Навіны.
18.20 "Рабакоп".
19.10 Беларускі гіт-парад.
19.15 Тэма дня.
19.30 Крэда. Праграма для дзелавых людзей.
19.50 "Зямля, зямлянкі, землякі". Д. ф.
20.40 Калыханка.
21.00 Панарама.
21.45 "Тэлебарометр".
22.00 "Плата за праезд". М. ф.
23.35 "Крок".

ГРТ

11.00, 14.00, 17.00, 22.50 Навіны.
11.20 Лыжы. Чэмпіянат свету.
13.20 "У пошуках страчанага". П. Алейнікаў.
14.20 "Таямніцы старога Лондана".
14.45 "Ад сэрца да сэрца".
15.10 Цін-Тонік.
15.40 "Ніко і яго сябры".
16.10 ...Да шаснаццаці і старэйшым.
16.35 "Вакол свету".
17.15 "Дзяўчына па імені Лёс".
18.10 Час пік.
18.35 Джэнтльмен-шоў.
19.00 "Мая сям'я".
19.45 Добрай ночы, малышы!
20.00 Час.
20.45 "Нэл". М. ф.
23.00 Прэс-экспрэс.

Расія

7.00, 10.00, 16.00, 19.00, 22.00 Весткі.
7.15, 8.20, 9.55, 1.10 Тавары — поштай.
7.25, 17.40 "Клубнічка".
7.55 "Дарагая рэдакцыя..."
8.30, 19.35 Сам сабе рэжысёр.
9.05, 20.10 "Санта-Барбара".
13.25 "Безыменная зорка". М. ф., 1-я ч.
14.30 "Гісторыя аднаго кахання".
15.10 Мультфільм.
15.25 Экспавеснік.
15.30 На парозе стагоддзя.
16.15 Іваноў, Пятроў, Сідараў і іншыя.
16.55 Там-там навіны.
17.05 Лукамор'е.
17.25 Паглядзі на сябе.
18.10 Момант ісціны.
18.40 Асабліва важныя персоны.
21.10 Добры вечар.
22.30 "Эх, дарогі!"
23.10 Чэмпіянат свету па лыжных відах спорту.
0.10 Блак-нот.
1.00 Толькі для дарослых.

Санкт-Пецярбург

15.05, 19.25 "Гісторыя кахання".
15.55, 18.55, 21.55 Інфарм ТБ.
16.05, 21.00 "Вуліцы Ларэда". М. ф., 1-я ч.
16.55 Дзіцячае ТБ.
17.30 "Рэйс 85-85". Тэлеспектакль. Ч. 1-я.
18.30 Санкт-Пецярбург запрашае Алімпіяду-2004.
18.40 Вялікі фестываль.
19.10 Спорт.
20.15 Асабістая справа.
20.45 Тэлеслужба бяспекі.
22.00 Падзея.
22.20 Спартыўны агляд.
22.35 "Закулiссе".

НТБ

18.00, 21.00, 23.00 Сёння.
18.40 Герой дня.
19.05 "Удава Дракулы". М. ф.
20.40 Група "Парк Горкага".
21.40, 23.20 Часінка.
22.00 "Хуткая дапамога". М. ф.
24.00 "Уратуй і абарані". М. ф.

Пятніца, 28 лютага

Беларускае тэлебачанне

7.30 Ранішні кактэйль.
7.45, 17.10 Беларускі гіт-парад.
7.50, 16.45 Эканамікст.
8.00, 13.00, 15.00, 18.00, 23.50 Навіны.
8.10 "Тэлебарометр".
8.20 Аўта-парк.
8.30 "Дакрананне". Д. ф.
9.00 Тэлебачанне — школе. Беларуская літаратура. 11-ы клас.
9.30 Мультфільм.
9.45 Люстэрка.
10.05 Каралеўскае паляванне.
10.45, 18.20 "Рабакоп".
12.25 "Зорная ростань". Тэлевізійны конкурс маладых артыстаў эстрады.
15.10 Відэакурс французскай мовы.
15.40 "Крок". "Праўнікі".
16.10 Творцы. Асветнік Сімяон Полацкі.
17.00 Сталіца. Ахова здароўя.
19.15 Тэма дня.
19.30 Чарнобыль: праблемы і вырашэнні.
20.05 Радавод.
20.40 Калыханка.
21.00 Панарама.
21.50 "Пагоня". М. ф.
23.20 Акалада.

ГРТ

11.00, 14.00, 17.00, 22.50 Навіны.
11.20 "Семнаццаць імгненняў вясны". М. ф., 6-я ч.
12.35 КВЗ-асарці.
13.00 "Юрый Лотман. Захавальнік культуры".
14.20 "Таямніцы старога Лондана".
14.45 "Новыя казкі Шахеразады..." М. ф., 1-я ч.
15.50 Рок-урок.
16.25 "Магія: свет звышнатуральнага".
17.20 "Дзяўчына па імені Лёс".
18.15 Чалавек і закон.
18.45 Поле цудаў.
19.45 Добрай ночы, малышы!
20.00 Час.
20.45 "Двайны ўдар". М. ф.
22.05 Погляд.
23.00 "Стваральнік ідалаў". М. ф.
1.00 Прэс-экспрэс.

Расія

7.00, 10.00, 16.00, 19.00, 22.00 Весткі.
7.15 Медыцынскі веснік.
7.25, 17.40 "Клубнічка".
7.55 "Дарагая рэдакцыя..."
8.20, 9.55 Тавары — поштай.
8.30, 19.35 L-клуб.
9.00 21 кабінет.
9.25 Момант ісціны.
13.20 Чэмпіянат свету па лыжных відах спорту.
13.45 "Безыменная зорка". М. ф., 2-я ч.
14.55 "Залатая карта Расіі". Суздаль.
15.25 Экспавеснік.
15.30 Арэна для сенсацый.
16.15 Іваноў, Пятроў, Сідараў і іншыя.
16.55 Там-там навіны.
17.05 Лукамор'е.
17.25 Паглядзі на сябе.
18.10 Эканамічны агляд.
18.40 Асабліва важныя персоны.
20.05 "Каралі расійскага вышукy". М. ф., 1-я ч.
21.10 Добры вечар.
22.30 Начны экспрэс.
23.10 "Недарэчнасць удваіх". М. ф.

Санкт-Пецярбург

11.55, 13.55, 15.55, 18.55, 21.55 Інфарм ТБ.
12.10, 19.30 "Гісторыя кахання".
13.00 Тэрмін адказу — сёння.
14.10 Ток-шоў "Наўздагад".
14.35 Мультфільм.
14.45, 21.00 "Вуліцы Ларэда". 2-я ч.
15.35, 20.45 Тэлеслужба бяспекі.
16.10 "Зоркі Марыінкі". Юлія Махаліна.
16.50 Зебра.
17.30 "Рэйс 85-85". Ч. 2-я.
18.30 Санкт-Пецярбург запрашае Алімпіяду-2004.
18.40 Вялікі фестываль.
19.10 Спорт.
20.15 "Чорны кот". Мастацка-публіцыстычная праграма.
22.00 Падзея.
22.20 Спартыўны агляд.
22.30 Як быць каханымі.
23.00 "Ваўчыцы". М. ф.

НТБ

17.30 Футбольны клуб.
18.00, 21.00, 23.00 Сёння.
18.40 Герой дня.
19.05 "Назад у СССР". М. ф.
20.40 "Алё, Фіма!"
21.40, 23.20 Часінка.
22.00 "Хуткая дапамога". М. ф.
23.45 "Божа мой, як нізка я апусцілася". М. ф.

Субота, 1 сакавіка

Беларускае тэлебачанне

8.00, 15.00, 21.00 Навіны.
8.10, 18.45 Беларускі гіт-парад.
8.15 Існасць. Духоўная праграма.
8.45 Рэгіён.
9.15 Лёс мой і надзея.
9.45 Здароўе.
10.15 Урокі Н. Наважылавай.
10.45 "Ён, яна і дзеці". М. ф.
12.00 Свет прыроды і захапленняў.
12.20 "Цішыню збераж ам разам".
12.50 Палацу культуры Белсаўпрофа — 40 гадоў.
13.20 Алімп: ад падножжа да вяршыні.
13.40 Калаж.
14.10 Тэлевізійны АРТ-клуб.
15.10 Мультфільмы.
15.30 Наваколле.
15.55 Творцы.
16.40 Чацвёртае вымярэнне.
17.00 "Заставайцеся з намі".
17.35 Зорная ростань.
18.15 Галерэя.
19.05 "Леапард". М. ф.
20.40 Калыханка.
21.45 "Забавы маладых". М. ф.
23.05 Відзьма-нявідзьма.

ГРТ

7.00 "Алеся". М. ф.
8.25 "Вялікае падарожжа Болека і Лёлека".
8.45 Хатняя бібліятэка.
9.00, 14.00, 17.00 Навіны.
9.10 Слова пастыра. Мітрапаліт Кірыл.
9.30 Не зявай!
10.00 Ранішняя пошта.
10.35 Смак.
10.55 "Запрашэнне да музыкі".
11.25 Казкі. Новы круг.
11.50 Відавочнае-неверагоднае.
12.20 "Два капітаны". М. ф.
14.20 "Падводная адысея каманды Кусто".
15.10 Мультфільмы.
15.50 Амерыка з М. Таратутам.
16.20 У свеце жывёл.
17.25 Памяці Лісцева.
17.55 "У бой ідуць адны старыя". М. ф.
19.30 Расійскі праект.
19.45 Добрай ночы, малышы!
20.00 Час.
20.55 Злачынства без пакарання. Размова ў студыі.
21.55 "Блакітная бездань". М. ф.
0.00 Лыжы. Чэмпіянат свету.

Расія

7.00 Мультфільмы.
7.45 "Фантагера — пячора Залатой Ружы". Дзіцячы серыял.
8.35 "Здароўе".
8.45 У свеце жывёл.
9.15 Клуб "Адрэналін".
9.30 Па вашых пісьмах.
10.00 Весткі ў адзінаццаць.
10.30 Парламенцкі тыдзень.
11.20 "Чырвоная кніга".
11.35 "Лёшкаў луг". Д. ф., 1-я ч.
12.20 Ананімныя суразмоўцы.
13.00 Весткі пра...
13.20 "Малады Пікасо".
14.15 Чэмпіянат свету па лыжных відах спорту.
15.25 Бясконцае падарожжа.
15.55 "Паэт у Расіі — больш, чым паэт".
16.20 "Цёмная" для І. Паіна.
16.35 Суботні вечар РТБ.
16.45 "Як многа дзяўчат цудоўных..."
17.40 РТР у гасцях у тэлегледачоў.
17.55 Суботні вечар з Аляксандрам Калягіным.
19.00 Весткі.
19.35 Гарачая тэма.
19.50 "Каралі расійскага вышукy". М. ф., 2-я ч.
21.00 "Адзін супраць усіх".
21.15 Адкрытыя навіны.
22.10 "Сітуацыя". Інтэрактыўнае шоў.
22.25 Рэпарцёр.
22.45 Праграма "А".
23.40 Клуб славутых дэтэктываў.
0.05 "Бай-бай, бэбі!" М. ф.

Санкт-Пецярбург

9.10 "Гонар маю".
9.40 "Дзяўчына і Гранд". М. ф.
11.10 Ток-шоў "Наўздагад".
11.35 Да юбілею ЦЮГа імя А. А. Брянцава.
11.55, 13.55, 15.55, 18.55 Інфарм ТБ.
12.10 Да 60-годдзя Пецярбургскага ТБ.
14.10 Яшчэ адна Расія.
14.45 Рэгіёны прадстаўляюць...
15.25 Фінансы для рэгіёнаў.
16.10 Спартыўны агляд.
16.30 Гульня "Лато-бінга".
17.30 Музычная праграма.
18.30 Слова — дэпутатам.
18.40 Вялікі фестываль.
19.20 Экспрэс-кіно.
19.50, 22.35 "Залатая міна". М. ф.
20.55 Свецкая хроніка.
21.10 Блеф-клуб.
21.45 "Парад парадаў" прадстаўляе Кая Метава.

НТБ

17.00 Час "Ч".
17.30 "Дог-шоў". Я і мой сабака.
18.00, 21.00 Сёння.
18.30 "Справы смешныя. Справы сямейныя". М. ф.
19.00 "Кікбоксер". М. ф.
20.45 Лялькі.
21.45 Надоечы-61.
22.30 "Байкі з склепа". М. ф.
23.00 Шоў "Імперыя страсці".
23.40 Трэцяе вока.
0.10 "Плэйбой-шоў".

Нядзеля, 2 сакавіка

Беларускае тэлебачанне

8.00 "Ганна Герман. Лёс і песні". Фільм-канцэрт.
9.05 "Кола часу". Сакавік. Гістарычны каляндар.
9.35 "Апошні сон Барыса Сачанкі". Д. ф.
9.45 Мульціклуб.
10.15 Студыя "Акно".
10.35 "Усё нармальна, мама!"
11.05 Тураб'ектыў.
11.25 Арсенал.
11.55 Творцы.
12.25 Вострай натхнення.
13.10 "Вайна ў паветры".
13.35 Вяршыня свету. Тэлевіктарына.
14.05 Вяскоўцы. "Поле чакае руплівых".
14.35 Гісторыя кахання.
15.00, 21.10 Навіны.
15.10 Госці ў дом.
15.40 "Падранкі". М. ф.
17.10 "Крок". "Оскар". Тэлегульня.
17.40 "Развітальны тур артыста". Канцэрт Іосіфа Кабзона ў Менску.
19.10 Абібок.
19.40 Калыханка.
20.00 Рэзананс.
20.50 Спартыўны тэлекур'ер.
21.30 Ток-шоў "Карамболь".
22.05 "Тэрмінатар-2". М. ф.
0.45 "Бархатны сезон".

ГРТ

7.00 "Чужыя тут не ходзяць". М. ф.
8.15 Мультфільмы.
9.00, 14.00, 23.05 Навіны.
9.10 Бесталковыя нататкі.
9.25 Пакуль усе дома.
10.05 Ранішняя зорка.
10.55 "Армейскі магазін".
11.20 Ігрaй, гармонік любы!
11.50 "Небяспечна для жыцця". М. ф.
13.25 Смехапанарама.
14.20 Вяртанне Трэццякоўкі.
14.45 "Сімфанічныя таямніцы".
15.10 "Клуб падарожнікаў".
15.55 Мультфеерверк.
16.40 Адзін на адзін.
17.10 Шчаслівы выпадак.
18.10 "Іван Васільевіч мяняе прафесію". М. ф.
20.00 Час.
20.40 "Клуб "Белы папугай".
21.35 Лыжы. Чэмпіянат свету.
22.35 Футбольны агляд.
23.15 "Кацярына, толькі адно каханне". М. ф.

Расія

7.00 Лукамор'е.
7.30 "Фантагера. Пячора Залатой Ружы". 2-я ч.
8.20 Латарэйныя навіны.
8.35 Мультфільмы.
9.05 Добрай раніцы, краіна!
9.45 Прысяга.
10.15 Расійскае лато.
10.55 Уральскія самарокі.
11.00 Кніжная лаўка.
11.15 "Лёшкаў луг". Д. ф.
12.15 Рамансіяда.
12.30 Чалавек на Зямлі.
13.00 Весткі.
13.20 Лепшыя гульні НБА.
14.15 "Урача выклікалі?"
14.45 Вечны рухавік.
15.15 Сад культуры.
15.45 Нічога, акрамя...
16.00 Чароўны свет Дыснэя.
17.00 Увесь свет.
17.45 Мужчына і жанчына.
18.25 Караоке па-расійску.
19.00 Люстэрка.
20.00 Рэпартаж ні аб чым.
20.20 "Каралі расійскага вышукy". М. ф., 3-я ч.
21.20 "К-2" прадстаўляе: Марк Захараў у праграме "Фрак народа". Перадача 2-я.
22.15 "Ва ўсіх на вуснах".
22.30 У Ксюшы.
23.05 Рэк-тайм.
23.20 Мітусня вакол раяля.

Санкт-Пецярбург

8.40 Гаючае слова.
9.10 Тата, мама і я — спартыўная сям'я.
9.40 Авертайм.
10.10 "Паляўнічыя".
11.05 Раман з героем.
11.30 "Эскізы харэаграфіі". Тэлефільм.
11.55, 13.55, 15.55, 18.55 Зваротны адлік.
12.15 "Ластаўкі і вераб'і". М. ф.
13.20 "Дзень казак". Муз. тэлефільм.
14.10 Яшчэ адна Расія.
15.10, 18.30 Санкт-Пецярбург запрашае Алімпіяду-2004.
16.05 "Без назвы". Забаўляльная праграма.
16.35 Дзіцячае ТБ.
17.30 Музычная праграма.
18.40 Скарбы Пецярбурга.
19.15 "Мы разам". Відэафільм з удзелам віцэ-губернатара В. Н. Шчарбакова.
19.45, 22.25 "Незакончаная вячэра". М. ф.
20.55 Ва ўсіх на вачах.
21.10 Ноў спонкні.
21.55 Міжнародны агляд.

НТБ

17.30 Праграма М. Фаменкі "Расійскія цвікі".
18.00 Сёння.
18.30 "Справы смешныя. Справы сямейныя". М. ф.
19.00 "Гангстэрскія хронікі: амерыканская гісторыя".
20.00 Вынікі.
21.10 "Чалавек дажджу". М. ф.
23.35 Магазін на канапе.
0.05 Эратычныя шоў свету.

Sport-Спорт

Біятланісты абараніліся ад рэкеціраў

У спартыўных колах Менска стала шырока вядома пра выпадак, які здарыўся з нашымі біятланістамі, калі яны вярталіся дадому з чэмпіянату свету. На тэрыторыі Польшчы бліз Варшавы на іхнюю галаўную легкавушку, дзе знаходзіўся трэнер, напалі чатыры рэкеціры і сталі патрабаваць выкуп. Але тут падаспеў аўтобус, дзе знаходзіліся нашы "страляючыя лыжнікі", якія адразу кінуліся на дапамогу свайму настаўніку. Рэкецірам давялося ўцякаць. Але ж не ў кожным аўтобусе едуць майстры спорту ды яшчэ з вінтоўкамі.

Хакей зімовай Алімпіяды ў Нагана

Застаецца год да хакейнага турніру зімовай Алімпіяды ў Нагана (Японія), але ўжо зараз канчаткова вырашаецца, хто туды паедзе і з кім давядзецца змагацца ў папярэднім групавым турніры за права выхаду ў асноўны круг спаборніцтваў. Наша хакейная каманда трапіла ў групу "В", і ёй давядзецца памерыцца сіламі з камандамі Францыі, Германіі і Японіі. У групе "А" сышліся каманды Італіі, Славакіі, Казахстана і Аўстрыі. У выпадку, калі наша зборная выйграе папярэдні турнір, яна трапляе ў групу "Д" да зборных ЗША, Швецыі і Канады. Ну, а свой першы ў гісторыі Алімпійскіх гульняў матч беларуская зборная па хакеі правядзе 7 лютага 1998 года.

Спідвэй — гэта матагонкі на лёдзе

Назіраць, як матагоншчыкі стрымгалоў імчаць па лядовай трасе — захапляльна, але каштуе значнага нервовага напружання. Немалымі адвагай і спрытам трэба валодаць, каб займацца такім відам спорту ды яшчэ імкнуцца апярэдзіць іншых. 8 — 9 сакавіка аматарам спідвэя будзе магчымасць пацікавацца на асаў гэтага спорту ў галандскім мястэчку Асэне, дзе пройдзе фінал асабістага чэмпіянату свету па матагонках на лёдзе. Спаборнічаць будуць 16 мацнейшых спідвэістаў свету. У іх ліку — двое беларусаў. Гэта віцябчанін Віктар Сідарэнка і матагоншчык з Ваўкавыска Алег Хоміч.

Іван Камар абагнаў двухразовага чэмпіёна свету

Гэта здарылася на міжнародных спаборніцтвах "Сусветны клас у Маскве-97". У закрытым памяшканні на скарочаных дыстанцыях змагаліся майстры лёгкай атлетыкі, напрацоўваючы майстэрства да чэмпіянату свету, які адбудзецца летам у Парыжы. А пакуль у Маскве першым на дыстанцыі 800 метраў стаў бягун Іван Камар з Менскай вобласці. Ён абагнаў такіх майстроў, як двухразовы чэмпіён свету Біллі Канчалах, а таксама расіяна Вячаслава Шабуніна (другое месца) і Андрэя Логінава.

На дыстанцыі 60 метраў другое месца заняў беларус Сяргей Карнялюк. Яго апярэдзіў расіянін Андрэй Фёдараў.

Вольная барацьба: Беларусь — Японія

У Менску ў зале Дзяржаўнага універсітэта інфарматыкі і радыёэлектронікі (былы радыётэхнічны інстытут) адбылася матчавая сустрэча нацыянальных каманд Беларусі і Японіі па вольнай барацьбе. Была яна даволі ўпартай, і гледачы атрымалі вялікае задавальненне. Лік сустрэчы 7:7. Праўда, у цяжкай вазе, што заўсёды асабліва адзначаецца аматарамі вольнай барацьбы, японскі асілак 125-кілаграмовы Хіраокі Абата з мінімальнай перавагай у дадатковы час перамог Максіма Шаўчэнку.

Падрыхтаваў У.ВЕРАБЕЙЧЫК.



У горадзе Крупкі Менскай вобласці Таццяну Якаўлеўну Белую ведаюць многія. Дзякуючы яе энтузіязму паўтара года таму ў Крупках адкрыўся гісторыка-краязнаўчы музей, у якім зараз налічваецца больш за тысячу экспанатаў. І ўсе яны сабраныя гэтай няўрымслівай жанчынай, якую вы бачыце на здымку на персанальнай выстаўцы яе работ у раённым Доме культуры ў Крупках.

На здымку: Выстава работ Т. Я. Белай.

Фота Яўгена КАЗЮЛІ, БелТА.

АСАМБЛЕЯ
дэмакратычных грамадскіх арганізацыяў Беларусі

Шаноўнае спадарства, калегі!

Паводле рашэння Форуму лідэраў няўрадавых арганізацыяў Беларусі 22 лютага ў Менску адбудзецца Асамблея дэмакратычных грамадскіх арганізацыяў нашай краіны. У аргкамітэт Асамблеі ўвайшлі прадстаўнікі наступных арганізацыяў: Цэнтр "Супольнасць", Менскі Міжнародны адукацыйны Цэнтр - IBB-Minsk, "Аб'яднаны шлях – Беларусь", Гуманітарны фонд "Наша Ніва", Фонд падтрымкі дэмакратычных рэформаў імя Льва Сапегі, Грамадскі навукова-даследчы цэнтр "Беларуская перспектыва", Цэнтр еўрапейскіх даследаванняў і культурных ініцыятываў "Еўрафорум", Фонд "Дзецям Чарнобыля", Міжнародная асацыяцыя гуманітарнага супрацоўніцтва, Асацыяцыя "Зямельная рэформа", Менская гарадская асацыяцыя "Свабоднае Слова", Асветніцкі маладзёвы цэнтр "Адукатар", Фонд падтрымкі парламентарызму і дэмакратыі, Таварыства беларускай школы, Фонд "Адкрытае грамадства", Беларускі Хельсінкскі камітэт, Таварыства беларускай мовы імя Ф.Скарыны, Фонд "Заканадаўчая ініцыятыва" ды інш.

Да ўдзелу ў Асамблеі запрашаюцца кіраўнікі ўсіх тых рэальна дзейных грамадскіх арганізацыяў, што вызнаюць каштоўнасці дэмакратыі, плюралізму, правоў чалавека, незалежнасці нашай краіны як перадумовы рэалізацыі грамадскай ініцыятывы.

Галоўная мэта Асамблеі – сфармуляваць, што і якім чынам могуць зрабіць грамадскія арганізацыі для абароны правоў чалавека, задавальнення патрэбаў і паляпшэння ўзроўню жыцця суайчыннікаў.

На Асамблеі плануецца шляхам адкрытай дыскусіі ды абмену інфармацыяй абмеркаваць наступныя пытанні:

— становішча грамадскіх арганізацыяў на цяперашні момант;

— перспектывы развіцця супрацоўніцтва паміж беларускімі і міжнароднымі арганізацыямі.

Асамблея будзе доўжыцца адзін дзень. Прадугледжаныя абед і кампенсацыя падарожных выдаткаў. Просім мець выпіску з пратаколу пасяджэння Вашай арганізацыі аб вылучэнні Вас прадстаўніком на Асамблею. Просім узяць друкаваныя і фотаматэрыялы аб дзейнасці арганізацыі.

Арганізацыйны камітэт.

Даты і падзеі ў лютым

20 — 610 гадоў таму (1387) кароль Польшчы Ягайла выдаў першы прывілей, які спрыяў распаўсюджванню каталіцтва на Беларусі і Жамойці.

22 — 450 гадоў таму (1547) у Вільні закаханы ў маладую ўдаву Барбару з Радзівілаў вялікі князь ВКЛ Жыгімонт Аўгуст, таксама ўдавец, наладзіў відовішча з рыцарскім турнірам, гусарскімі спаборніцтвамі і захопам абарончага замка.

— 75 гадоў таму (1922) памёр пісьменнік Ядвігін Ш. (Антон Лявіцкі) — пачынальнік жанру рамана ў беларускай літаратуры.

— 75 гадоў з дня нараджэння (1922) мастака Івана Ціханава.

— 65 гадоў з дня нараджэння (1932) скульптара Івана Міско.

23 — 200 гадоў таму расійскі імператар Павел І выдаў указ: "Приняв за благо представленный нам план о соединении Днепра с Двиной посредством р.Березины и Уллы, повелеваем... произвести оный в действо.... отпустить... в число требуемой по смете суммы 329387 руб. с копейками в нынешнем году из казначейств наших 80000 руб., а остальные... в будущих 1798 и 1799 гг".

24 — 415 гадоў таму (1582) Папа Грыгоры XIII спецыяльнай булаю "Inter grawissimus" прывёў астранамічы год у адпаведнасць з касцельным календаром.

— 95 гадоў з дня нараджэння (1902) Івана Хвораста, артыста балета, балетмайстра, фальклрыста.

— 60 гадоў з дня нараджэння Ігара Крэйдзіка, мастака-плакаціста.

26 —195 гадоў з дня нараджэння (1802) Віктара Гюго — знакамітага французскага паэта, драматурга і пісьменніка.

— 85 гадоў з дня нараджэння (1812) пісьменніка Уладзіміра Карпава.

— 65 гадоў таму (1932) выйшаў першы нумар газеты "Літаратура і мастацтва".

Падрыхтаваў З.С.

І смех і грэх

Сур'ёзная справа

Жонка мужу:

— Ужо цэлы месяц не можаш вырашыць, які тэлевізар купіць. Раней ты быў больш рашучы — мне прапанову зрабіў на трэці дзень нашага знаёмства!

— Тэлевізар — гэта справа сур'ёзная! Ля яго я буду сядзець цэлымі вечарамі.

Дыета-цуд

Доктар пытаецца ў свае пацыенткі:

— Ці дала якія-небудзь вынікі тая часочная дыета?

— Частковыя — я ўжо страціла сваіх сябровак.

Рада

Халасцяк скардзіцца:

— Доктар, я стаў такім нервовым: муха сядзе на коўдру — прачынаюся.

— Вам трэба пабрацца з якойнебудзь салодкай жанчынай.

Пачутае "У Лявона"

— А чаму менавіта з салодкай?

— Мухі будуць сядаць на яе.

Прычына

Суддзя, што вядзе справу пра развод, пытаецца ў мужа:

— Чаму вы хочаце развесціся з жонкай?

— Хачу пазбыцца апазіцыі.

Просты прыклад

Госця шынка скардзіцца сябрам, што не магла на простым прыкладзе растлумачыць сыну, што такое прагрэсія.

— Вось табе прыклад, — падказвае ёй сяброўка. — Чым больш свет цывілізуецца, тым больш расце вытворчасць замкоў.

Рыцар

— Ці можаш ты быць рыцарам?

— Канешне, але толькі пры адной умове: калі гэта чужая жанчына.

Пачуў З. С.

Афарызмы

Рыбе — вада, птушцы — паветра, зверу — лес, стэп, горы. А чалавеку патрэбная Радзіма.

Міхаіл Прышвін.

Дурнота чалавека вынікае або з ягоных чынаў, або з ягоных словаў.

Аляксандр Пушкін.

Чым людзі адукаваней становяцца, тым повязі, што звязваюць іх з Бацькаўшчынай, павінны быць мацнейшымі.

Аляксандр Радзішчаў.

Ёсць людзі, у якіх няма нічога свайго, нават сваёй віны — заўсёды ў іх іншыя вінаватыя.

Ян Райніс.

Узаемная любоў паміж людзьмі ёсць асноўны закон чалавечага жыцця.

Леў Талстой.

Ахвяраванне ўсяго сябе на карысць усіх ёсць прыкмета сама высокага развіцця асобы.

Фёдар Дастаеўскі.

Калі ты адрынаеш (адкідаеш) магчымасць у людзей шчырага, глыбокага, некарыслівага перакanання, то я цалкам абгрунтавана магу давесці, што табе самому невядомыя ніякія помыслы.

Мікалай Дабралюбаў.

Чалавек, які разумее і любіць прыроду, не зробіць дрэннага чыну — ён прайшоў "духоўны універсітэт".

Леанід Лянонаў.

Шчасце будучага чалавецтва толькі ў ведах.

Антон Чэхаў.

Як забойча дзейнічае на розум і сэрца чалавека такі стан, пры якім ўсе ягоныя думкі выключна прыкаваныя да дробязных клопатаў пра дробязныя справы.

Мікалай Чарнышэўскі.

Пародыі

Георгій ЮРЧАНКА

Астральны чакаляд

Мяне пакрылі цвіль і чакаляд.

Зміцер Вішнёў.

Вясёлка ў стогнах тоне.
З-пад торфу — бляск агню.
Вачнястыя бяздонні
Ірвуцца ў вышыню.

Вятры наўскач прабеглі.
Дарэмна не міргай.
Смяецца з кошкі Бэглі
Кятлівы папугай.

Плывуць у галаву сны,
Туманіцца пагляд.
Сілком піхаю ў вусны
Зацвілы чакаляд.

На шпалах мроям цесна.
Імкнуць удаль вякі.
І вяжуцца бяссэнсна
Астральныя радкі.

Растка ЗАКІЧ

Патрыёты

***

Я так люблю сваю зямлю, што ніколі не змог бы яе араць, вострым плугам напакутаваныя грудзі яе раздзіраць, як гэта вякамі робяць нячулыя сяляне.

Я так люблю сваю зямлю, што не змог бы з улоння яе выдзіраць унутраныя скарбы, як гэта вякамі робяць неміласэрныя шахцёры.

Я так люблю сваю зямлю, што ніколі б не змог яе твар псаваць будынкамі, якія засланяюць найлепшыя краявіды, як гэта вякамі робяць неўтаймаваныя будаўнікі.

Я так люблю сваю зямлю, што толькі сяджу і дзівуюся на яе!

* * *

Тыя, у каго мала патрыятызму, ніколі не могуць належнае аддаць, а тым, у каго патрыятызму шмат, народ не можа належнага прапанаваць!

Таму патрыятызму бесперапынна вучаць — ад пачатковай школы да універсітэта, ад калыскі да труны, але ніхто яшчэ не вывучыў усе рахункі і разлікі ў сувязі з патрыятызмам.

З сербахарвацкай мовы пераклаў **Іван ЧАРОТА.**

У старых фаліянтах

Рысь

(Заканчэнне.)

Сапраўды рысіную натуру меў наш герой, любіў задзірацца. Нагодай для адной такой сутычкі сталася манера ўбірацца. Строі ж Караль Рысь меў самыя модныя. Генрых Равускі нат сцвярджаў, што ягоны герой быў тварцом нясвіжскай моды. Гэта не проста сабе ўявіць, бо там жа быў Радзівілаў двор.

Аднойчы ў княжым палацы мелася быць урачыстасць з танцамі. Загадзя ўсе цікавіліся, у чым будзе пан Рысь, асабліва нясвіжскія моднікі Міхал Рэйтан, Лявон Баротоўскі, Пётр Вязевіч. Яны хацелі апрануцца ў штосьці падобнае. Але ён сам не хваліўся, а рысевага краўца нельга было падкупіць: той быў шчырым прыяцелем свайму гаспадару.

Невядома адкуль у апошні дзень стала вядома, што пан Рысь з'явіцца на баль у высокіх ботах з жоўтага атласу; боты гэтыя будуць зашпіляцца на клямры так, каб былі відсілымі. Часу, каб зрабіць такія ж, у супернікаў не было. Але прыдумалі...

Пры княжым двары жыў Тадэвуш Сцыпіён, бедны, але з даўняга роду, што нібы ад самога рымскага консула паходзіў. Ён адмыслова валодаў пяром, а таму меў сабе дадатковa капейку, пішучы суплікі Радзівілавым падданым, баярам ды габрэям. Але грош за грошам ганяўся ў ягонай кішэні, бо трэба было прыстойна апранацца да памагаць маці. Сцыпіён любіў жартаваць, таму згадзіўся ўчудзіць. З квачом у руцэ і гаршком, поўным дзёгцю, ён схаваўся ў гасцёўні і чакаў Рыся, як выжла дзічыну.

Нарэшце прыйшоў моднік — аж зіхціць увесь, пунсовы і залаты. Аж тут Сцыпіён пацюху пырсь-пырсь квачом яму па ботах. Рысь жа, задраўшы галаву, ідзе далей — адна рука на шаблі, другая матляе кутасом, — у ярка асветленую залу, вітаецца налева, направа, нізка схіляецца перад князем Радзівілам, шчабеча кампліменты паням, пачынаючы ад князёвых сясцёр. І раптам чуе за сабой смех, дык не можа адгадаць прычыну таго. Аж тут сястра князя ваяводы, да якой якраз падышоў, і кажа яму:

— Мой шаноўны стражнік, што гэта каля цябе дзёгця чуваць! Ці табе на іншыя парфумы не хапіла?

Рысь сумеўся, апускае вочы, і як гляне на свае боты — збялеў ад сораму і злосці.

— Хто мяне так зняважыў? — крыкнуў.

А смех яшчэ большы. У князя аж слёзы пацяклі ад смеху. Рысь жа раззлаваўся не на жарты.

— Бяда таму, — казаў, — хто мяне абразіў. З-пад зямлі яго дастану.

І знік з залы.

Наступным днём, ніхто не ведаў, якім чынам Рысь даведаўся, чыя гэта была справа. Сцыпіён спрабаваў прасіць прабачэння, але пакрыўджаны не прыняў просьбы, а паабяцаў:

— Кажу табе, галгане, і далей трымацца за клямку княжага двара, бо як толькі Нясвіж пакінеш, то адразу ж атрымаеш 500 лозаў.

Вось тут пан Сцыпіён і адчуў, што не цыганская, але шляхечая кроў цячэ ў ягоных жылах.

— Як смееш дубцамі палохаць шляхціча? Ці забыўся: калі твой бацька дубасіў табе скуру каля аргана, мой быў другім вершнікам у кнскай кавалерыі, куды цябе і абозным не прынялі б.

Сцыпіён пайшоў да князя, упаў яму ў ногі і сказаў, што гонар, які за адзіную спадчыну мае, не дазваляе яму служыць Радзівілу, пакуль не атрымае сатысфакцыі за крыўду. Урэшце князь згадзіўся на двубой. Тадэвуш і Караль сышліся на лугавіне паміж Клецкам і Дунайчыцамі. Паводле дамовы, павінны былі біцца конна, кожны з пісталетам у руцэ і з шабляй пры боку. Секунданты паставілі іх за пяцьдзесят крокаў аднаго ад другога. Сутычка працягвалася не даўжэй "Ойча наш". Стрэлы не мелі выніку, то хапіліся за шаблі. Рыся перш Сцыпіён ніби пёркам па руцэ чыркануў, а той у адказ так махнуў шабляй, што рука пана Тадэвуша з шабляй упала на зямлю, а пасля ён сам асунуўся.

Хутка памчалі яго ў Клецак да лекара і той захаваў жыццё шляхціцу.

Змяніўся і Рысь. Яшчэ на лугавіне прасіў прабачэння ў Сцыпіёна. І ў Клецку, пакуль той не выздаравеў, служыў хвораму. Урэшце аддаў яму руку сваёй адзінай дачкі.

Байку Генрыха Равускага пераказаў З. С.

Пры передруку спасылка на NS абавязковая

Наша Слова (8)

Аўтары надрукаваных матэрыялаў адказваюць за дакладнасць фактаў і іншых звестак. Пункт гледжання аўтара можа не адпавядаць меркаванню рэдакцыі. Рукапісаў рэдакцыя не рэцэнзуе і назад не вяртае.

Індэкс 63865. Замова 270 Наклад 2294 паасобнікі.

Друкарня выдавецтва "Беларускі Дом друку". 220041, г.Менск, пр. Ф.Скарыны, 79.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Падпісана ў друк 19.02.1997 г. у 15 гадзін.